Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

13 ЛЮТАГА 2015 г. ПЯТНІЦА № 28 (27886) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

**Галоўны вынік 16-гадзінных перамоў «нармандскай чацвёркі» ў Мінску: з нуля гадзін 15 лютага агонь у паўднёва-ўсходняй частцы Украіны павінен быць спынены.**

СТАР. 2



**Праграма тэлебачання на наступны тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**



**Таксі не звычайнае – сацыяльнае**

СТАР. 13

*ЛІЧБА ДНЯ*

**Br3 трлн 751,1 млрд**

***склалі падатковыя паступленні ад індывідуальных прадпрымальнікаў у бюджэт краіны ў 2014 годзе, тэмп росту да 2013-га — 102,2. У цэлым па краіне ў разліку на аднаго індывідуальнага прадпрымальніка ў бюджэт паступіла Br15,1 млн, што ў супастаўных цэнах вышэй за ўзровень адпаведнага паказчыка мінулага года на 2,1%. Найбольшы ўклад у фарміраванне даходаў бюджэту забяспечваецца плацельшчыкамі адзінага падатку, паступленні ад якіх склалі Br1 трлн 623,8 млрд, або 43,3% у агульнай суме плацяжоў ад індывідуальных прадпрымальнікаў. На 1 студзеня 2015 года на ўліку ў падатковых органах знаходзіцца 248 952 індывідуальныя прадпрымальнікі, іх колькасць у параўнанні з пачаткам мінулага года вырасла на 0,2%.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 13.02.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15300,00 | ▼ |
| Еўра | 17320,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 229,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 588,46 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

■ Спецыяльны рэпартаж

# ХУТКІЯ ЛЫЖЫ НА ІСКРЫСТЫМ СНЕЗЕ

## АБНОЎЛЕНЫЯ «РАЎБІЧЫ» ГАТОВЫЯ СУСТРЭЦЬ БУДУЧЫХ ЗОРАК БІЯТЛОНА

**Наша краіна зноў у цэнтры спартыўных падзей. Літаральна праз некалькі дзён на старт у комплексе «Раўбічы» выйдуць першыя ўдзельнікі чэмпіянату свету па біятлоне сярод юніёраў і юнакоў. Зразумела, славутых спартсменаў на стрэльбішчы нашы балельшчыкі не ўбачаць, але ў іх будзе выдатная магчымасць зафіксаваць, як на спартыўным небасхіле загараюцца «зорачкі» будучых чэмпіёнаў.**



Беларуская біятланістка Яўгенія ЯКАЎЛЕВА збіраецца на чэмпіянаце свету паказаць усё, на што здатная.

### АД ТРЭНЕРСКАЙ БІРЖЫ ДА ПРЭС-ЦЭНТРА

«Раўбічы» — гэта наш Рупольдынг, славуты біятлонны цэнтр, які ведалі і ведаюць далёка за межамі Беларусі. Менавіта тут праходзіла некалькі чэмпіянатаў свету па біятлоне, Кубак свету па лыжных гонках, а перамогі здабывалі легендарныя Франк Ульрых і Эйрык Квальфос, Валерый Мядзведцаў і Марк Кірхнер... Апошні чэмпіянат свету тут адбыўся ў 1990-м. І вось праз 25 гадоў «Раўбічы» ўжо ў абноўленым, сучасным выглядзе зноў прымаюць першынство сусветнага значэння.

Калі сонечнай раніцай трапляем на стадыён, узнікае адчуванне, што амаль усё да стартаў падрыхтавана. На самой арэне рабочых няшмат. Відаць, уносяць апошнія праўкі.



Фота Надзеі БУЖАН.

Трыбуны стадыёна гатовы прыняць 2,5 тысячы чалавек.

— «Начынка» ёсць, засталася «абгортка», — кажа **Леанід КАРАСЬ, намеснік дырэктара Рэспубліканскага цэнтра алімпійскай падрыхтоўкі «Раўбічы»,** з якім мы сустрэліся ў адміністрацыйным корпусе комплексу. — Асноўная праца завершана. Засталося афарміць стадыён, стартавы гарадок. Усё гэта мы запланавалі зрабіць напярэдадні пачатку спаборніцтваў, каб не перашкаджаць трэніровачнаму працэсу нашай зборнай.

Аб рэканструкцыі спартыўнага цэнтра аб'явілі ў 2012 годзе, і літаральна за некалькі гадоў выканалі грандыёзную работу. Цалкам замянілі інжынерныя сеткі, пабудавалі яшчэ адну гасцініцу, стралковы цір, кабіны для падрыхтоўкі лыжаў, дамкі камандных раздзявальняў. Падрыхтавалі падземны пераход на старт і фініш, трэнерскую біржу, памост, на якім падчас спаборніцтваў знаходзяцца спецыялісты, усталявалі святлодыёдныя экраны. Да 6 метраў пашырылі лыжаролерную трасу. Яе адлегласць цяпер складае 7,5 кіламетра. Яна цалкам асвятляецца.

СТАР. 4

# ГАСЦІННАСЦЬ І ЎЛАСНАЯ ПАЗІЦЫЯ


Фота БЕЛТА.

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка лічыць, што галоўнае сёння — рэалізаваць падпісаныя ў Мінску дакументы па выніках перамоў «нармандскай чацвёркі» і кантактнай групы па Украіне. Пра гэта ён заявіў журналістам у Палацы Незалежнасці, праводзячы кіраўнікоў «нармандскай чацвёркі», паведамляе БЕЛТА.**

Адказваючы на пытанне аднаго з журналістаў, кіраўнік беларускай дзяржавы адзначыў, што «настрой сустрэчы лідараў «нармандскай чацвёркі» быў абсалютна забяспечаны». «Але галоўнае не гэта. Дакументаў у гісторыі нараджалася шмат. Цяпер галоўнае — рэалізаваць гэтыя дакументы. Гэта, як вы разумееце, працэс значна больш складаны, чым стварэць. Тут суткамі не абыдзешся», — сказаў беларускі лідар.

Звяртаючыся да журналістаў, Аляксандр Лукашэнка адзначыў: «Калі б вы чулі вось гэтыя рабочыя дыялогі і перамовы, вы звар'яцелі б. Радуйцеся, што вам не давялося ўдзельнічаць у рабочых «тусоўках». Гэта вельмі цяжкая, вельмі нудная работа».

«Я вельмі задаволены, што Беларусь выканала сваю функцыю, сваю ролю. Але галоўныя дзеючыя асобы, вядома, былі кіраўнікі дзяржаў. Яны проста малайцы. Яны вытрымалі гэты марафон», — сказаў беларускі лідар. Пры гэтым ён заклікаў не лічыць, што перамовы ішлі доўга. «Пытанні вайны і міру вырашаюцца месяцамі, а то і гадамі, а тут удалося дасягнуць згоды аб прыпыненні вайны на працягу ўсяго толькі 15 гадзін», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Адказваючы на пытанне аб тым, чаму абмеркаванне праходзіла за зачыненымі дзвярамі, Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што практыка вырашэння такіх пытанняў іншых фарматаў не церпіць і не ведае. «Гэта нармальна, што рабочыя пытанні абмяркоўваюцца за зачыненымі дзвярамі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт Беларусі таксама расказаў журналістам пра некаторыя падрабязнасці арганізацыі перамоў лідараў «нармандскай групы» ў Палацы Незалежнасці, якія праходзілі амаль 16 гадзін.

«І накармілі, і ўсім забяспечылі — вы бачылі, як гэта было арганізавана, — сказаў беларускі лідар. — Усім кармілі, што ў Беларусі, Расіі вырабляецца».

«Елі яечню, сыр, малочныя прадукты, выпілі некалькі вядзёр кавы», — расказаў ён.

«Пазменна, я так разумею, спалі, асабліва эксперты, — адзначыў кіраўнік беларускай дзяржавы. — Пазменна спалі, таму што галава павінна быць светлая пры такіх фармулёўках дагавораў». Пры гэтым ён звярнуў увагу на тое, што кіраўнікам дзяржаў адпачыць не ўдалося.

Адказваючы на пытанне журналістаў аб тым, ці змог Аляксандр Лукашэнка паспаць гэтай ноччу, ён здзівіўся: «Як я магу спаць?.. Як без боепрыпасаў можа ісці вайна на мірным фронце? — вобразна выказаўся кіраўнік беларускай дзяржавы. — Мая задача была боепрыпасы падносіць своечасова. Таму я стараўся выконваць сваю функцыю. Вы бачыце, што ў Мінску ў нас усё размеркавана, і кожны робіць сваю справу».

Беларускаму лідару нагадалі, што падчас нядаўняга дыялогу з журналістамі ён абяцаў падносіць каву ўдзельнікам перамоў па Украіне, толькі б яны дамовіліся, і спыталі, ці рабіў ён гэта ў час цяперашніх перамоў «нармандскай чацвёркі». «Так», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт таксама падзякаваў журналістам за арганізаваную работу на гэтым саміце.

Аляксандр Лукашэнка таксама расказаў пра свае планы наведаць з афіцыйным візітам Грузію, адзначыўшы, што гэты візіт некалькі разоў пераносіўся, аднак цяпер ён адбудзецца.

Прэзідэнт Беларусі таксама даў эксклюзіўнае бліц-інтэрв'ю вядучаму праграмы «Весткі ў суботу» на тэлеканале «Расія 1» Сяргею Брылёву. Аляксандр Лукашэнка даў кароткую ацэнку вынікам праведзеных у беларускай сталіцы перамоў «нармандскай чацвёркі» па ўрэгуляванні крызісу ва Украіне.

«Хачу, каб вы ведалі: мы гэта не афішавалі, але свае прапановы і сваю пазіцыю да перамоў (аб урэгуляванні ўкраінскага крызісу) мы выказалі, і ўсе ўдзельнікі не ведалі. Упэўнены, што наша пазіцыя па Украіне ў бліжэйшай будучыні будзе запатрабавана. Магчыма, гэта нейк паўплывала на тое, што вось у такім фармаце перамовы адбыліся ў Мінску», — адзначыў у ходзе інтэрв'ю Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы адказаў і на пытанні, што датычацца перспектыў далейшага развіцця адносін Беларусі з Захадам, станаўлення Еўразійскага эканамічнага саюза.

Плануецца, што інтэрв'ю будзе паказана ў вячэрнім эфіры тэлеканалаў «Расія 1» і «Расія 24».

# НОЧ ДЗЕЛЯ МІРУ

**Наша пакаленне трымае экзамен на непрыняцце вайны. Расія, Беларусь, Украіна, Германія, Францыя... Колькі дзесяцігоддзяў у гэтых краінах плакалі ўдовы, колькі мільёнаў бацькоў не пабачылі больш сваіх дзяцей, колькі сірот вырасла, не ведаючы сваіх бацькоў? І колькі было затрачана ўсімі, хто перажыў жах апошняй Вялікай вайны, сіл, каб навучыць наступныя пакаленні пазбягаць вайны ўсімі сіламі.**

І вось мы апынуліся на яе парозе. Тысячы людзей ужо гінуць, тысячы ўдоў плачуць, бацькі хаваюць сваіх дзяцей, а дзеці, сотні, — не пабачаць ужо ніколі сваіх бацькоў. І вось настала ноч — з 11 на 12 лютага, калі ўсе мы, затойваючы подых, напружана чакалі — ці ўдасца тым, ад каго гэта залежыць, зрабіць так, каб кашмар скончыўся. Каб распачатая вайна была спыненая, каб здаровы розум і чалавечнасць зноў вярнуліся ў наша жыццё. Той ноччу ў Мінску ішлі двайныя перамовы: паміж лідарамі чатырох краін (Украіны, Расіі, Германіі і Францыі) і паміж удзельнікамі кантактнай групы па Украіне, да якой раніцай далучыліся лідары самаабвешчаных Луганскай і Данецкай народных рэспублік. Перамовы доўжыліся каля 16 гадзін. І пакуль у Мінску шукалі магчымасці для міру, на ўсходзе Украіны працягваліся баі...

— Гэта была не самая лепшая ноч у маім жыцці, але раніца, на мой погляд, добрая, бо, нягледзячы на ўсе складанасці перамоўнага працэсу, нам усё ж такі ўдалося дамовіцца пра галоўнае, — сказаў журналістам позняй раніцай у чацвер прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін.

Расійскі лідар заклікаў абодва бакі праяўляць стрыманасць і зрабіць усё, каб развядзенне войскаў і, галоўным чынам, цяжкай тэхнікі, прайшло без нікому не патрэбнага праліцця крыві.

Пётр Парашэнка па выніках перамоў паведаміў, што начальнікі генштабоў Украіны і Расіі 13 лютага правядуць перамовы па кантролі за захаваннем рэжыму спынення агню ў Данбасе. Самае галоўнае, што на гэты раз удалося дасягнуць у Мінску, гэта дамова аб спыненні агню, сказаў ён.

Сур'ёзнай надзеяй на ўрэгуляванне сітуацыі ва Украіне і вялікай палёгкай для Еўропы назваў вынікі ночы на чацвер прэзідэнт Францыі Франсуа Аланд. Ён пацвердзіў, што была дасягнута дамоўленасць пра спыненне агню і палітычнае ўрэгуляванне ўкраінскага канфлікту. «Разам з тым яшчэ патрэбна работа па ажыццяўленні дасягнутых пагадненняў», — дадаў французскі лідар.

Станоўча ацаніла вынікі 16-гадзінных перамоў па Украіне і канцлер Германіі Ангела Меркель. «Цяпер ёсць іскра надзеі», — сказала яна журналістам. Германія бачыць надзею ў тым, што ўдалося дамовіцца пра спыненне агню ва Украіне з 15 лютага і пра адвядзенне цяжкага ўзбраення.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

# БЕЗАЛЬТЭРНАТЫЎНАСЦЬ ВЫКЛЮЧНА МІРНАГА ЎРЭГУЛЯВАННЯ

**Лідары «нармандскай чацвёркі» выкарыстаюць свой уплыў для рэалізацыі комплексу мер па выкананні мінскіх пагадненняў. Пра гэта гаворыцца ў дэкларацыі, якая была прынята па выніках перамоў, паведамляе БЕЛТА.**

У дакуменце гаворыцца, што «Прэзідэнт Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін, Прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка, Прэзідэнт Французскай Рэспублікі Франсуа Аланд і Канцлер Федэратыўнай Рэспублікі Германія Ангела Меркель пацвярджаюць поўную павагу да суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці Украіны. Яны цвёрда перакананы ў безальтэрнатыўнасці выключна мірнага ўрэгулявання, цалкам гатовы пайсці на любыя магчымыя захады як паасобку, так і сумесна ў гэтых мэтах».

У гэтым кантэксце лідары ўхваляюць комплекс мер па выкананні мінскіх пагадненняў, прыняты і падпісаны ў Мінску 12 лютага 2015 года ўсімі, хто таксама падпісаў мінскі пратакол ад 5 верасня 2014 года і мінскі мемарандум ад 19 верасня 2014 года. Лідары будуць уносіць уклад у гэты працэс і выкарыстоўваць свой уплыў на адпаведныя бакі, каб спрыяць выкананню гэтага комплексу мер, падкрэсліваецца ў дэкларацыі.

Германія і Францыя акажуць тэхнічную падтрымку для аднаўлення сегмента банкаўскай сістэмы ў закранутых канфліктам раёнах, магчыма, шляхам стварэння міжнароднага механізму для садзейнічання ажыццяўленню сацыяльных выплат.

Лідары падзяляюць перакананне ў тым, што ўмацаванне супрацоўніцтва паміж Еўрапейскім саюзам, Украінай і Расіяй будзе садзейнічаць урэгуляванню крызісу. У гэтых мэтах яны падтрымліваюць працяг трохбаковых перамоў паміж Еўрасаюзам, Украінай і Расіяй па пытаннях энергетыкі з тым, каб ажыццявіць крокі ў развіцці «зімовага газавага пакета».

Яны таксама падтрымліваюць трохбаковыя перамовы паміж Еўрапейскім саюзам, Украінай і Расіяй у мэтах выпрацоўкі практычнага вырашэння пытанняў, якія выклікаюць занепакоенасць Расіі, у сувязі з выкананнем пагаднення аб глыбокай і ўсёабдымнай зоне свабоднага гандлю паміж Украінай і ЕС.

Лідары па-ранейшаму адданыя ідэі стварэння агульнай гуманітарнай і эканамічнай прасторы ад Атлантыкі да Ціхага акіяна на аснове поўнай павагі да міжнароднага права і прынцыпаў АБСЕ.

Лідары будуць і надалей прытрымлівацца выканання мінскіх пагадненняў. З гэтай мэтай яны дамовіліся аб стварэнні кантрольнага механізма ў «нармандскім фармаце», які будзе праводзіць сустрэчы з рэгулярнай перыядычнасцю.

■ Меркаванне

# САМІТ НАДЗЕЙ



**Несумненна, па значнасці і важнасці саміт, які праходзіў у Мінску 11-12 лютага 2015 года, мае мала аналагаў у найноўшай беларускай гісторыі.**

Пераважная большасць сустрэч на вышэйшым узроўні ў Мінску да 2014 года былі звязаны з фарміраваннем і функцыянаваннем розных інтэграцыйных утварэнняў на постсавецкай прасторы. У Мінску абмяркоўваліся такія фарматы, як СНД і МС, ЕЭП і АДКБ, стварэнне ЕАЭС. Трэнд, які ўзнік пасля разгарання ўкраінскага канфлікту, калі ў Мінску пачалі праводзіцца найважнейшыя сустрэчы з мэтай знайсці ўдалы сцэнарый спынення грамадзянскай вайны, кардынальна іншы — абмяркоўвацца сталі пытанні не пра тэмпы прыросту эканомікі або аспекты ваенных вучэнняў, а пра жыццё і смерць — непасрэдны ўдзельнікаў канфлікту і мірнага насельніцтва.

Першая спроба дамовіцца ў ліпені не была ўдалай, але падчас сустрэч у жніўні і верасні ўдалося дабіцца часовага поспеху — на працягу некалькіх месяцаў братазабойчая грамадзянская вайна на ўкраінскай тэрыторыі істотна знізіла інтэнсіўнасць. На жаль, у студзені зноў узрасла напружанасць на ўкраінскай зямлі і рэзка павялічылася колькасць ахвяр. Першая спроба Беларусі вярнуць канфліктуючыя бакі да абмеркавання спрэчных пытанняў не пры дапамозе стральбы, а за сталом перамоў (у Мінску 16 студзеня) сарвалася. Чарговая сустрэча, 30 студзеня, таксама не адбылася, але 31 студзеня ўжо атрымалася правесці першыя перамовы, а на 11-12 лютага былі ўзгоднены аднachасовыя перамовы на беларускай зямлі адразу ў двух фарматах — нармандскім і мінскім.

Пра глабальнае значэнне саміту 11-12 лютага можна меркаваць хаця б па тым, што пачатак саміту кіраўнікоў дзяржаў і ўрадаў Еўрасаюза, які прайшоў 12 лютага ў Бруселі, быў затрыманы па прычыне перамоў «нармандскай чацвёркі» ў Мінску.

Як і меркавалася, з-за таго, што на саміце і на пасяджэнні кантактнай групы абмяркоўваліся вельмі няпростыя пытанні, гэта ўскладніла магчымасць прыйсці да рашэнняў, якія б задавальнялі ўсіх. У той жа час тых, хто лічыць такое працяглае абмеркаванне яўным негатывам, можна супакоіць — у доўгіх і зацяжных перамовах ёсць глыбокі сэнс. Задача перамоўцаў, якія сабраліся ў Мінску, была не ў тым, каб падпісаць нейкі дакумент і тут жа раз'ехацца па сваіх справах. Сумны досвед не толькі ранейшых перамоў па Украіне, а і многіх падобных мерапрыемстваў па вырашэнні іншых канфліктаў, сведчыць: важна не падпісаць нейкае пагадненне, а дабіцца яго далейшага выканання. А каб яно выконвалася, неабходна дэталёва абгаварыць інтарэсы ўсіх уцягнутых бакоў і знайсці тыя кампрамісы, якія будуць выгадныя ўсім. А інакш падпісаны дакумент не атрымае практычнай рэалізацыі, або яго ажыццяўленне застопарыцца неўзабаве пасля падпісання. Галоўнай задачай саміту ў Мінску было знайсці падчас перамоў тыя пункты судакранання, па якіх удасца не толькі дасягнуць трывалага пагаднення аб спыненні ваенных дзеянняў на бліжэйшыя дні або тыдні, а і знайсці аснову для трывалага міру на гады.

Ці атрымалася вырашыць гэту задачу, стане зразумела пазней. Пакуль што дасягнутыя ў Мінску дамоўленасці ацэньваюць непасрэдна самі ўдзельнікі перамоў. Прэзідэнт Расіі Уладзімір Пуцін паведаміў, што кантактная група падпісала дакумент аб комплексе мер, накіраваных на імплементацыю мінскіх дамоўленасцяў. На яго думку, адной з асноўных праблем доўгіх узгадненняў было нежаданне кіраўніцтва Украіны прама кантактаваць з лідарамі данецкіх і луганскіх сепаратыстаў. Уладзімір Пуцін таксама расказаў, што лідарамі краін «нармандскай чацвёркі» была прынята заява аб падтрымцы адпаведнага працэсу. Паводле слоў Прэзідэнта Францыі Франсуа Аланда, дасягнутыя па выніках саміту дамоўленасці дастаткова значныя. Ён адзначыў: «Гэта сур'ёзная надзея. Гэта вялікая палёгка для Еўропы».

Галоўныя вынікі — дамоўленасць аб спыненні агню з 15 лютага 2015 года ў рамках перамір'я і рашэнне аб адвядзенні цяжкага ўзбраення. Пры гэтым украінскі бок адводзіць яго ад лініі цяперашняга супрацьстаяння войскаў, а сепаратысты ад той, што кіруюцца лініяй, узгодненай 19 верасня ў Мінску. Іх прадстаўнікі — кіраўнікі Данецкай народнай рэспублікі Аляксандр Захарчанка і Луганскай народнай рэспублікі Ігар Платніцкі — адзначылі, што ўжо дасягнутыя пункты пагаднення затрабуюць дадатковага ўзгаднення, перамовы па якіх працягнуцца. Пры гэтым было заяўлена, што на гатоўнасць лідараў ДНР і ЛНР падпісаць дамоўленасці прама паўплывала кансалідаваная пазіцыя лідараў Германіі, Францыі і Расіі.

Гэты апошні факт мае як пазітыўныя, так і негатыўныя аспекты. Непасрэдным плюсам з'яўляецца тое, што Прэзідэнт Расіі змог знайсці пункты судакранання з Прэзідэнтам Францыі і канцлерам Германіі. Мінусам — тое, што лідары ДНР і ЛНР фактычна прызналіся, што падпісалі пагадненне пад ціскам кансалідаванай пазіцыі кіраўнікоў Расіі, Францыі і Германіі, а гэта азначае, што яны лічаць інтарэсы ўтвараненняў, якія яны прадстаўляюць, недасягнутымі. А гэта можа прывесці ў далейшым да зрыву дасягнутых дамоўленасцяў.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук** ■

# НАД ЭПОХАМІ

**Літаратура — як люстэрка часу. Як яго нерв.**
**Магчымасць гэты час ствараць, мяняць. Рабіць яго больш чалавечным.**
**Вось пра што ішла гаворка на міжнародным сімпозіуме літаратараў «Пісьменнік і час», які праходзіў у рамках XXII Мінскай міжнароднай кніжнай выставы-кірмашу.**
**Сабраліся пісьменнікі розных краін у выставачным комплексе на праспекце Пераможцаў у Мінску. А побач — сустрэча глабальнага значэння. Што дало падставы для абмеркавання, з чаго і пачалася размова пісьменнікаў розных краін.**

Да прысутных звярнуўся **Аляксандр РАДЗЬКОЎ, памочнік Прэзідэнта Беларусі,** які ад імя кіраўніка дзяржавы павітаў удзельнікаў сімпозіума:



— Дзякуй за працу — палітычную, творчую, ідэалагічную, выхаваўчую. За жывое слова, якім вы валодаеце і з дапамогай якога вы працуеце з людзьмі. Пісьменнік павінен быць у цэнтры падзей. Вось вы зараз трапляеце ў самы эпіцэнтр. Літаральна побач знаходзяцца кіраўнікі пяці дзяржаў. Шмат хто з нас па кнігах ведае, што такое вайна, — вы, пісьменнікі, дапамагаеце змагацца за мір і кажаце, як няпроста захаваць яго. Вось сёння гавораць пра тое ж на іншым узроўні..

Пісьменнікам заўсёды ёсць што сказаць людзям, лічыць **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.** Яны павінны спрыяць аб'яднанню, сваім пяром могуць паспрабаваць спыніць тэрор, гвалт у свеце.



«У XXI стагоддзі свет сутыкнуўся з выклікамі і пагрозамі. Беларусь робіць усё магчымае, каб у суседняй краіне запанаваў мір і каб мы як мага хутчэй сталі сведкамі, калі там у кожны дом пастукаецца надзея і больш не будзе страт», — сказала міністр.

Звяртаючыся да пісьменнікаў, Лілія Ананіч адзначала, што Беларусь ідзе з мірам, заўсёды рада супрацоўніцтву. Міністр выказала надзею, што такія сустрэчы будуць працягвацца. «Неабходна, каб літаратура працягвала служыць меркай сапраўдных каштоўнасцяў і спрыяла ўмацаванню дружбы народаў», — падкрэсліла яна.

Удзельнікам прадстаўнічага форуму было што абмяркоўваць. Вядома, увесь спектр праблем і тэм для абмеркавання вызначыць немагчыма. Але галоўнае, што аб'ядноўвала ўсіх прысутных, — жаданне гуманізаваць грамадства, адкрываць сваім краінам асаблівасці розных культур, у тым ліку і беларускай.

**Алесь БАДАК, пісьменнік, галоўны рэдактар часопіса «Полымя»:**



— Такія сустрэчы, такія кантакты вельмі патрэбны, асабліва сёння. У рыначную эпоху літаратуры крышку раз'ядналіся, на першы план выходзіць бізнес. І тое, што прапаноўваюць літагенты, кніжныя выдавецтвы, тое і на паверхні. Але гэта не значыць, што на паверхні самая сур'ёзная літаратура. Але ёсць і тое, што тычыцца культуры наогул, і тага, што тычыцца грамадскай супольнасці ў свеце. Таму што літаратура заўсёды ўплывала на грамадскае жыццё і будзе ўплываць, што б ні казалі пра сённяшні час: што літаратура не тая, не выконвае свае функцыі. Гэта не зусім так. Таму што кніжка, якая выходзіць накладам 1000 экзэмпляраў, можа зрабіць большы ўплыў на грамадства, на свядомасць чалавека, чым кніжка, якая выходзіць тыражом 100 000 ці 200 000 экзэмпляраў, ці нават мільённым тыражом... Сёння разглядаюцца дзве важныя праблемы: міжнароднае супрацоўніцтва, наладжванне кантактаў, уплыў літаратуры, развагі пра гэта на грамадскім узроўні, што літаратура можа зрабіць. І другая важная праблема, якая разглядаецца, — маральная адказнасць пісьменніка перад чытачом, перад самой літаратурай.

**Член саюза кітайскіх пісьменнікаў Лао МА:**



— Мы тут сабраліся ў імя літаратуры, каб кантактаваць сродкамі высокіх слоў, на духоўным узроўні — пагадзіцеся, гэта вялікае дасягненне. Зносіны праз літаратуру дазваляюць крануць душу, дастукацца да сэрцаў. Літаратура — гэта магчымасць захаваць доўгую культурную традыцыю любога народа і краіны. Проза, паэзія і драма адыгрываюць тут важную ролю. Менавіта дзякуючы літаратуры нашы народы могуць кантактаваць без бар'ераў і межаў. Слова, якое нясе цеплыню, дыхае, мае голас і смак, дазваляе нам глыбей зразумець адзін аднаго на эмацыянальным узроўні і жыць разам.

**Драган ЛАКІЧАВІЧ, пісьменнік, перакладчык (Сербія):**



— Катэгорыя часу па-асабліваму вызначае і прадвызначае пісьменніка. І ў філасофскім, і ў эстэтычным сэнсе. Па-свойму час нараджае пісьменніка. Але ёсць верагоднасць, што і пахавае яго. Пісьменнік адчувае час, але не заўсёды натхняецца часам. Адчуваючы рух, цячэнне часу, рытм яго і яго праявы ў самім сабе, пісьменнік выказвае гэта ў адпаведнасці са сваім тэмпераментам і ў сваім уласным стылі — кожны па-свойму. Творы існуюць залежна і ад пісьменніка, і ад часу. У наш час — зменены, дэфармаваны, спажывецкі — усталёўваюцца новыя, іншыя каштоўнасці. Але ёсць гісторыя культур і старажытных цывілізацый, ад якіх дайшлі каштоўнасці вечныя. Найбольшую каштоўнасць чалавецтва і ў наш час маюць любоў, свабода, гонар, вернасць, велікадушнасць. А гэта нас пераконвае: ва ўсе часы (і ў наш таксама) чалавечая істота мае патрэбу ў паэзіі і ў песні песняў. На пытанне: «Што самае цяжкае на гэтым свеце?» — лірычны герой беларускага пісьменніка Максіма Танка адказвае: прайсці праз вернасць. Вечная думка пісьменнікаў усіх часоў...

**Нэлі АБАШЫНА-МЕЛЬЦ, галоўны рэдактар часопіса «Талін» (Эстонія):**



— Я перакладчыца і вельмі даражу гэтай прафесіяй, таму што перакладчыкі дазваляюць пазнаёміць свет з тым, што думае кожны народ. Гэта складае асноўную каштоўнасць літаратуры. Мы ў Эстоніі захавалі перакладчыцкую школу. У нас перакладаецца тое, што ствараецца на эстонскай мове, на рускую. Кожныя 10 гадоў мы складаем зборнікі навел. Прывезлі з сабой іх і яшчэ шмат іншых кніг, каб падараваць Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. Што тычыцца перакладаў з беларускай, то, вядома, у нас перакладалі паэзію — былі прамыя перакладчыкі. Цяпер прамых засталося мала, і руская мова з'яўляецца як бы мастком, каб даць магчымасць пазнаёміць з літаратурай. Я зараз прыехала сюды з намерам, што мы можам скласці адмысловы нумар нашага часопіса, куды б маглі ўвайсці творы маладых літаратараў з Беларусі. Нам трэба бліжэй пазнаць адно аднаго: столькі можа быць адкрыццяў.... Ведаеце, у Беларусі мне асабліва спадабалася адно слова: у вас ёсць слова «сябры». А паэстонску гэта значыць «сыбяр»...

❍ ❍ ❍

Удзельнікі міжнароднага форуму літаратараў «Пісьменнік і час» не засталіся ў баку ад важнай палітычнай падзеі, што адбывалася ў Мінску. Яны прынялі зварот у адрас «нармандскай чацвёркі», паведамляе БелТА.

«Мы, прадстаўнікі 28 краін, удзельнікаў міжнароднага сімпозіума літаратараў «Пісьменнік і час «, які праходзіць у кантэксце XXII Мінскай міжнароднай выставы-кірмашу, з вялікім задавальненнем ўспрынялі вынікі праведзенай сустрэчы «нармандскай чацвёркі», — гаворыцца ў звароце.

Мінскі палітычны плацдарм спрыяў прарыву ў галіне спынення баявых дзеянняў на паўднёвым усходзе Украіны, лічаць літаратары.

Пісьменнікі 28 краін павіншавалі прэзідэнтаў Расіі, Францыі, Украіны, канцлера Германіі, кіраўнікоў самаабвешчаных Данецкай і Луганскай народных рэспублік з праяўленай палітычнай воляй і мудрасцю пры пошуку рашэння выхаду з сітуацыі баявых дзеянняў, якія прывялі да гібелі тысяч людзей і разбурэння ўсёй інфраструктуры на паўднёвым усходзе Украіны.

Літаратары выказалі асаблівую падзяку Прэзідэнту Беларусі Аляксандру Лукашэнку і выказаліся ў падтрымку яго ініцыятывы, якая прывяла да ўзаемаразумення бакоў.

Яны таксама выказалі ўпэўненасць, што вынікі мінскіх перамоў атрымаюць далейшае пазітыўнае развіццё, і ў Еўропе знікне гэты небяспечны ачаг вайны і здзекаў з людзей.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

# ЯДНАННЕ Ў ПАЧУЦЦЯХ

## Як літаратура паказвае агульнае паміж Беларуссю і Кітаем



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**У дзень падпісання, можна сказаць, гістарычнага мемарандума паміж Міністэрствам інфармацыі Беларусі і Галоўным дзяржаўным упраўленнем па справах прэсы, выдавецтваў, радыёвяшчання, кінематаграфіі і тэлебачання Кітая аб супрацоўніцтве ў кнігавыдавецкай справе адбыўся і Беларуска-кітайскі выдавецкі форум. Ганаровыя госці не прамінулі сказаць аб тым, што паміж беларусамі і кітайцамі насамрэч шмат агульнага, а літаратура, як трапяткая сфера, заснаваная на пачуццях, лепш за ўсё гэта адлюстроўвае.**

«Кітай і Беларусь — добрыя сябры і стратэгічныя партнёры. Паміж нашымі краінамі — шчырая дружба. З моманту ўсталявання нашых дыпламатычных адносін развіваюцца ўсё больш дынамічна і эфектыўна. Шмат поспехаў мы маем і ў гуманітарных абласцях, — сказаў на форуме **Пасол Кітайскай Народнай Рэспублікі Цуй ЦЫМІН.**

На мерапрыемстве прысутнічалі і чатыры ўжо вядомыя нам пісьменнікі — А Лай, Лао Ма, Сі Чуань і Сюй Цзэчэнь. Тут жа выявілася, што вядомы кітайскі пісьменнік А Лай атрымаў траўму рукі, што не перашкодзіла яму выступіць і паэтычна пра гэтае здарэнне расказаць — вядома ж, пісьменнік.

«Калі прызямляўся наш самалёт — я ўбачыў белыя палі, лясы, вёскі. Я і мае суайчыннікі любілі чытаць Святлану Алексіевіч, Яўгенія Замяціна, Васіля Быкава. Недзе ў 1980-х я прачытаў першую кнігу савецкага аўтара — гэта былі тры апавяданні Васіля Быкава. Калі мы прыехалі ў гасцініцу, ужо сцямнела. Але я хацеў паглядзець на гэтую зямлю, тую Беларусь, пра якую чытаў у 20 гадоў. Выйшаў — і паслізнуўся. Лежачы на зямлі я паглядзеў у неба, убачыў дзве бярозы, не вельмі выразныя зоркі... Мабыць, як у Васіля Быкава адзін з герояў, падкошаны куляй... Мы павінны верыць у сілу літаратуры. З надзеяй на супрацоўніцтва мы прыехалі ў зімовую Беларусь, і галоўная наша місія і надзея — каб адбывалася яднанне людзей менавіта ў пачуццях».

Мемарандум аб супрацоўніцтве Кітая і Беларусі заключаны на тэрмін да 2020 года. Здаецца, што з гэтага атрымаецца не проста пераклад і выданне кітайскіх аўтараў у Беларусі і беларускіх у Кітаі. Мы таксама можам пераняць добрыя напрацоўкі кітайскай выдавецкай сістэмы, якімі гатовая падзяліцца, напрыклад, Кітайская выдавецка-медыйная карпарацыя з ТОП-50 выдавецтваў Кітая. Намеснік дырэктара карпарацыі Сунь Уэму (таксама пісьменнік і былы журналіст) расказаў, што за апошнія тры гады ў сваёй краіне яны сталі на першым месцы па рэалізацыі і колькасці дзяржаўных прэмій. Пры гэтым арыентуюцца на замежныя рынкі, пераклады на іншыя мовы і гандаль аўтарскімі правамі — маюць 28 прадстаўніцтваў, якія распаўсюджваюць прадукцыю ў 130 краін свету. У чым маюць пэўныя поспехі — штогод аб'ёмы продажу растуць, а імпарт да таго ж стымулюе экспарт. Карпарацыя таксама актыўна ўдзельнічае ў міжнародных кніжных выставах-кірмашах.

Галоўнае, яны маюць вялікія рэсурсы ў аўтарскім праве — ужо напрацавана база з вялікай колькасцю кітайскіх пісьменнікаў. Кітайская выдавецкая карпарацыя таксама можа пасадзейнічаць у выданні вучэбнай літаратуры, якая будзе дапамагаць жадаючым вывучаць кітайскую мову.

**Міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ** пракаментавала: «У гэтыя знакавыя дні ў нашай краіне адбываюцца сапраўды лёсавызначальныя для ўсяго свету падзеі (маюцца на ўвазе мінскія перамовы ў «нармандскім фармаце»). Мы пераканані, што сапраўдны дыялог слова — гэта той алгарытм, які павінен быць галоўным ва ўзаемаадносінах паміж народамі. Слова павінна вылечваць, развіваць, вучыць дабру, заклікаць да міру. Я ўпэўнена, што пісьменнікі, якія прысутнічаюць у гэтай зале, — нашы сябры з Кітая — прыбылі да нас менавіта з такой высокай місіяй і словамі дабра, міру, узаемаразумення. Вельмі б хацелася, каб такі аўтарытэтны міжнародны кніжны форум, які ў падобным маштабе праходзіць у Беларусі ўпершыню, знайшоў новыя грані супрацоўніцтва. Каб такія прафесійныя зносіны выліваліся ў новыя творчыя праекты, якія, безумоўна, будуць падтрымліваць Міністэрствам інфармацыі Беларусі і, я ўпэўнена, кітайскім бокам таксама.

Сёння падпісаны стратэгічны кніжны дакумент. На самой справе гэта дакумент міждзяржаўнага характару — мемарандум аб супрацоўніцтве ў праекце перакладу класічнай кітайскай літаратуры і класічнай беларускай літаратуры на дзяржаўныя мовы Беларусі і кітайскую мову. Вельмі важна, каб культура чытання добрай кнігі спадарожнічала і цяперашняму, і будучаму маладым пакаленням. Мы разумеем, што век новых інфармацыйных тэхналогій штосекундна пастаўляе такі аб'ём інфармацыі, з якім не зможа справіцца нават самая разумная машына. І важна, каб кніга, слова пісьменніка былі духоўным і маральным арыенцірам».

У сваю чаргу кітайскія госці запрасілі паўдзельнічаць беларускі бок у сваіх кніжных мерапрыемствах.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**

# ХУТКІЯ ЛЫЖЫ НА ІСКРЫСТЫМ СНЕЗЕ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пад прэс-цэнтр у «Раўбічах» аддалі былы судзейскі павільён. Памяшканне, як заўважае наш суразмоўца, абсталявана ўсёй неабходнай апаратурай і адначасова можа прыняць 120 журналістаў. Між іншым, весці анлайн-трансляцыю ў інтэрнэце можна будзе з любога месца стадыёна. Нас запэўнілі, што Wi-Fi ахоплівае ўсю тэрыторыю арэны.

Што да трыбун, цяпер яны разлічана на 2,5 тысячы гледачоў. Арганізатары разлічваюць на нядрэнную наведвальнасць: ад 2 тысяч у будныя да 10 — у выхадныя дні.

— Раней стадыён змяшчаў 5 тысяч гледачоў, — узгадвае Леанід Карась. — Трыбуны знаходзіліся перпендыкулярна стрэльбішчу. Цяпер на месцы адной з іх з'явіўся цір. Аднак, на маю думку, для гэтых спаборніцтваў падобнай умяшчальнасці будзе дастаткова. Акрамя таго, квіткі будуць прадавацца не толькі на трыбуну, але на тэрыторыю ўздоўж трасы. Калі пасля прымуць рашэнне правесці ў нас спаборніцтвы топ-узроўню, у нас ёсць магчымасць устанавіць часовыя трыбуны. Падобнай практыкай карыстаюцца на многіх стадыёнах.

Спадар Леанід лічыць, што надышоў той час, калі на наш спарткомплекс могуць раўняцца на Захадзе.

— Яго ўнікальнасць у тым, што ўсе аб'екты знаходзяцца ў адным месцы. А гэта тычыцца і харчавання, аднаўлення, пражывання і трэніровак спартсменаў. Падобнага нідзе няма. Па рэльефе наша траса з'яўляецца адной з лепшых у Еўропе. Што казаць, калі яшчэ да рэканструкцыі полькая лыжніца Юстына Кавальчык, двухразовая алімпійская чэмпіёнка, усю перадсезонную падрыхтоўку правяла ў нас. У маі заехала і толькі ў верасні з'ехала. А гэта аб нечым сведчыць. Пры гэтым «Раўбічам» Міжнародны саюз біятланістаў яшчэ да рэканструкцыі прысвоіў катэгорыю «А», што дазваляе праводзіць спаборніцтвы найвышэйшага ўзроўню. А сёння наш комплекс яшчэ палепшыўся.

## ХТО Ў ЛІДАРАХ?

Мы падыходзім да стрэльбішча, і міма нас на хуткасці праносіцца дуэт біятланістак. Тэмпература нізкая, а таму спартсменам прыходзіцца хаваць амаль увесь твар пад «буфамі», спецыяльнымі павязкамі. Пасля лыжных адрэзкаў яны заязджаюць на стралковую сесію, за якой уважліва ў глядзельную трубу сочыць трэнер. Ён робіць пэўныя заўвагі, паказвае спартсменам на планшэце кожны выстрал.

— І як страляюць? — пакуль дзяўчаты зноў выходзяць на лыжню, пасляваю спытаць ва **Уладзіміра МАХЛАЕВА, старшага трэнера жаночай групы, юніёрскай зборнай Беларусі па біятлоне.**

— Узровень стралковай падрыхтоўкі годны. Можна на нешта разлічваць. Але дзяўчаты — маладыя спартсменкі з невялікім міжнародным вопытам, а таму загадваць не трэба.

Сёння з 10 спартсменак, якія прэзентуюць Беларусь на чэмпіянаце свету, працуюць толькі дзве. У трэніровачным працэсе пераважае індывідуальны план. А таму нехта з іншых дзяўчат прыйдзе на другую трэніроўку, а хтосьці наогул атрымаў дзень адпачынку.

— У гэтых спартсменак ёсць некаторыя праблемы са стральбой пры высокім пульсе,— тлумачыць спецыфіку Уладзімір Анатольевіч. — А таму, каб узняць яго, перад агнявымі рубяжамі даём ім невялікія паскарэнні.

Агулам у склад нашай зборнай уваходзіць 20 спартсменаў, якія сфарміравалі каманду па выніках адборачных спаборніцтваў. Сваіх прадстаўнікоў у камандзе маюць амаль усе рэгіёны. Ганна Сола, Дзінара Алімбекава, Максім Варабей, Дар'я Блашко, Віктар Крыўко — лідары каманды, на якіх разлічвае трэнерскі штаб. Але баталіі ў Раўбічах чакаюцца гарачыя. Геаграфія ўдзельнікаў — шырокая. У Беларусь прыляцяць біятланісты з 42 краін. Канкурэнцыю паспрабуюць навязаць нават прадстаўнікі экзатычных Бразіліі, Новай Зеландыі і Аўстраліі. Праўда, кола сапраўдных прэтэндэнтаў на «залата» Раўбічаў куды больш вузкае.

— Сярод лідараў юнакоў і юніёраў тыя краіны, прадстаўнікі якіх дэманструюць добрыя вынікі ў дарослым біятлоне. А гэта Германія, Нарвегія, Расія... Але я не выключаю, што медалі заваюць спартсмены з іншых зборных, — сцвярджае **Аляксандр СЫМАН, старшы трэнер маладзёжнай зборнай Беларусі па біятлоне.** — Безумоўна, чакаем добрых вынікаў ад нашых лідараў, на якіх можна разлічваць. Чаканні і спадзяванні ёсць. Аднак будзем сачыць за тым, як усё задуманае рэалізуецца на практыцы.

**— Прагнозы надвор'я вас не хвалююць?**

— Калі для трас падрыхтуюць шмат штучнага снегу, праблем не ўзнікне. Мяркую, у падобным выпадку ён вытрымае любую адлігу.



Фота Надзеі Бужан.

**У перыяд першынства свету з ДС Карбышава (Мінск, Лагойскі тракт, 37, корпус 1) штодзённа будуць адпраўляцца аўтобусы. Інтэрвал руху — ад 30 хвілін да 1 гадзіны.**

**<u>Алена ЗУБРЫЛАВА, старшы трэнер па рэзерве нацыянальнай зборнай Беларусі:</u>**

**— У нас ёсць некалькі чалавек, якія сапраўды гатовы змагацца за медалі. Спадзяёмся, у іх усё атрымаецца. Хоць выступаць на хатнім чэмпіянаце значна складаней. Шмат увагі спартсменам надаецца з боку прэсы, блізкіх... Адказнасць вялікая. Усё гэта вельмі моцна цісне псіхалагічна. Паколькі нашы спартсмены вельмі маладыя, я хачу ім пажадаць, каб яны занадта не хваляваліся і былі ўпэўнены ў сваіх сілах.**

## У РАЦЫЁНЕ — ВУГЛЯВОДЫ

Мінчанка Яўгенія Якаўлева — адна з тых, хто прабіўся ў склад беларускай каманды і будзе выступаць на хатнім чэмпіянаце. Усмешлівая дзяўчына тлумачыць нюансы завяршальнай трэніроўкі і вядзе нас сваімі шляхамі па «Раўбічах».

Жыве наша зборная ў сучаснай трэцяй гасцініцы, якую адкрылі літаральна ў жніўні і ўжо паспелі абжыць спартсмены з нашай «нацыяналкі». Тут усё таксама трымаецца на дысцыпліне. Пад'ём у 7:15, пасля праводзіцца 45-хвілінная зарадка, сняданак, першая трэніроўка. Потым — абед і адпачынак. У другой палове дня праходзіць яшчэ адна трэніроўка, а пасля — вячэра, халасты трэнаж і сон. Адбой не пазней 23 гадзін. Рацыён біятланістаў таксама адрозніваецца ад звычайнага. Упор найперш робіцца на вугляводы. Акрамя таго, кожны робіць карысныя спартыўныя напоі. Многія таксама перад стартамі ў сваё меню ўключаюць курагу, чырвоную ікру і рыбу.

— Мінскім спартсменам трэнеры дазваляюць наведаць сваякоў, — кажа Яўгенія. — Але пры гэтым настойліва просяць сачыць за здароўем, выходзіць у грамадскія месцы толькі ў ахоўных масках. Самае крыўднае пасля шматлікіх трэніровак страціць форму з-за хваробы. А таму падобную павязку заўжды трымаю ў куртцы і пры неабходнасці надзяваю. Выглядае, безумоўна, дзіўна, але што зробіць.

Мы мінаем адміністрацыйны корпус і па сцежцы рухаемся да мастка праз вадасховішча. Краявіды тут па-зімоваму яркія, адметныя. Каларыт дадаюць амаль ручныя качкі і лебедзі, якіх час ад часу падкормліваюць госці. Праз хвіліну мы апынаемся ў светлым фае сучаснай гасцініцы. На сцяне нават размешчаны модныя гадзіннікі, які паказваюць час у розных гарадах планеты. На сайце спартыўнага комплексу пазначана, што суткі пражывання ў аднамесным нумары абыдуцца ў 295 тысяч рублёў.

—Тут ёсць усё неабходнае, — адчыняе дзверы ў свой пакой Святлана Маркоўская, сяброўка Яўгеніі па зборнай. — Добра працуе тэлебачанне, інтэрнэт. У гасцініцы таксама ёсць саўна і кавярня.

Вольнага часу ў біятланістаў цяпер няшмат. Але пры магчымасці дзяўчаты гуляюць па парку, ходзяць у краму, а калі нехта адзначае дзень народзінаў, могуць крышачку пасядзець у піцэрыі. Дарэчы, добрую рэкламу тамтэйшай піцы зрабіла ўсё тая ж Юстына Кавальчык. Яна неяк сказала, што лепшай піцы за раўбіцкую яшчэ нідзе не каштавала. Піца піцай, але ўсе думкі ў нашых спартсменаў сёння, зразумела, пра бліжэйшы чэмпіянат.

— Не хачу нічога планаваць, — на развітанне кажа Яўгенія. — На спаборніцтвы прыедзе шмат маіх блізкіх, і я проста хачу паказаць усё, на што я здатная.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

*Мінскі раён.*



■ Да ведама

# ГАЙДА НА БІЯТЛОН!

**А вось яшчэ адна прыемная навіна: нават калі ў каго з прыхільнікаў стралюючых лыжнікаў не атрымаецца ў гэтыя дні асабіста трапіць на трасу, адчуць азарт і запал гонак можна будзе падчас трансляцый, якія забяспечыць тэлеканал «Беларусь 5».**

Абсалютна ўсе гонкі маладзёжнага чэмпіянату тэлевізійнікі абяцаюць паказваць штодня ў прамым эфіры, таксама плануецца арганізаваць паўторы. Дадаткова пра самыя цікавыя моманты спаборніцтваў карэспандэнты «Беларусь 5» распавядуць у спецыяльных выпусках праграмы «PRO спорт. Навіны». Першыя прамыя трансляцыі стартаў юніёрскага чэмпіянату — індывідуальную гонку дзяўчат (да 19 гадоў) і юнакоў (да 19 гадоў) балельшчыкі ўбачаць ужо 18 лютага ў 9.55 і 13.30 адпаведна.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК**

■ Надвор'е

# Чарговая порцыя холаду

## Уначы на аўторак прагназуюцца маразы да мінус 18 градусаў

**У пятніцу пры павышаным фоне атмасфернага ціску ў асобных раёнах пройдуць невялікія ападкі ў выглядзе дажджу і мокрага снегу, паведаміла <u>спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.</u>**

Месцамі чакаецца туман і галалёдныя з'явы. Максімальная тэмпература паветра ўдзень складзе ад мінус 1 да плюс 4 градусаў. Істотна не зменіцца надвор'е ў Беларусі і ў выхадныя. Пры павышаным фоне атмасфернага ціску невялікія ападкі (дождж і мокры снег) чакаюцца толькі ў асобных раёнах краіны. Месцамі прагназуецца туман, галалёд і галалёдзіца на дарогах. Уначы на суботу і нядзелю чакаецца 1-7 марозу, а ўдзень — ад мінус 2 да плюс 3 градусаў, па паўднёвым захадзе — да 5 цяпла. Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных спецыялістаў, у пачатку наступнага тыдня да нас завітае яшчэ халаднейшае паветра з поўначы Еўропы. У панядзелак і аўторак будзе пераважна без ападкаў. Асобныя ўчасткі дарог слізкія. Тэмпература паветра ўначы на панядзелак складзе мінус 3-10 градусаў, пры праясненнях на поўначы краіны — да мінус 14. Уначы на аўторак падмарозіць яшчэ мацней, чакаецца 5-12 марозу, а на ўсходзе — да мінус 13-18 градусаў. Удзень у панядзелак і аўторак тэмпературны фон істотна павялічыцца, калі чакаецца ад мінус 5 градусаў да 2 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ**

ЗВЯЗДА
НАПЕРАД У МІНУЛАЕ
Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

**Песня — адзін з самых прыгожых відаў фальклору. Захоўваючы яе і перадаючы з пакалення ў пакаленне, людзі дзеляцца духоўным скарбам сваіх продкаў і нярэдка самі становяцца сям'ёй. У апошнім мы са здымачнай групай праграмы «Наперад у мінулае» тэлеканала «Беларусь 3» у чарговы раз упэўніліся, завітаўшы ў госці да ансамбля народнай музыкі і песні «Сяброўкі» з вёскі Блізніца Полацкага раёна.**



# З ПЕСНІ СЛОВА НЕ ВЫКІНЕШ

Сустрэча з ансамблем «Сяброўкі» адбылася ў маёнтку пана Лісоўскага. Зрэшты, не толькі сядзіба, але і сама вёска мае даўнюю і цікавую гісторыю. Паводле падання, жыў у гэтай мясцовасці некалі адзін вельмі багаты пан. Сядзіба знаходзілася ў цэнтры яго ўладанняў, а вакол былі лясы, лугі, ды яшчэ цагляны і вінны заводы. І называлася гэта месца Двор Варонічы. Вакол яго знаходзіліся хутары: Блізняцы, Блізніца. Блізняцы сваю назву набылі за тое, што ў мясцовых жанчын там часта нараджаліся дзеці-блізняткі. Блізніца — бо знаходзілася блізка ад хутара Блізняцы. У 70–80-х гадах мінулага стагоддзя было вырашана аб'яднаць два гэтыя хутары і Двор Варонічы і даць адзіную назву. Так з'явілася вёска Блізніца.

Сядзіба пана Лісоўскага пабудавана тут напачатку мінулага стагоддзя і да сёння яе знешні выгляд захаваўся амаль што нязменным. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі сям'я Лісоўскіх вымушана была з'ехаць у Польшчу, дзе і засталася. Сярод землякоў тых паноў існуе меркаванне, быццам перад ад'ездам у Польшчу Лісоўскі схаваў у сваім маёнтку скарб. Некаторыя і цяпер не страчваюць надзеі адшукаць тое багацце. Але смельчакоў ды іншых наведвальнікаў сядзібы часам пужае прывід гаспадара, пана Лісоўскага. Вядомы ўжо не адзін выпадак, калі людзі сведчылі пра сустрэчу з ім. Так, расказваюць, аднойчы бібліятэкарка Вольга Чобат пайшла дадому, зачыніўшы дзверы ў бібліятэку і музей «Бабін кут», якія размяшчаюцца побач на другім паверсе. У гэты час мастацкі кіраўнік Дома культуры Уладзімір Піскуноў працаваў за камп'ютарам на першым паверсе. Ён праз нейкі час і пачуў дзіўныя гукі наверсе, а калі падняўся ў музей, то ўбачыў расчыненыя дзверы і хістанне фіранак, нібы іх вецер гайдае, хаця ўсе вокны былі зачынены. Патэлефанаваў бібліятэкарцы, тая пацвердзіла, што ўсё было замкнёна на ключ. Давялося жанчыне вяртацца і зачыняць дзверы яшчэ раз.

Самы распаўсюджаны «цуд» — гук піяніна ў адным з класаў музычнай школы. Прычым сведкамі гэтага былі адразу некалькі чалавек. У вячэрні час тут можна было пачуць, як гучыць віртуозная, але невядомая мелодыя… Аднак калі нехта з супрацоўнікаў ішоў у клас, каб паглядзець, што ж адбываецца, то іграсціхала і ў пакоі нікога не аказвалася.

Каля маёнтка расце чароўнае дрэва — ясень. Лічыцца, калі да яго дакрануцца, то набіраешся жыццёвых сіл і здароўя, а прытуліўшыся лбом, можна і розум палепшыць, і жаданне загадаць. А пад маёнткам ёсць, магчыма, чароўны калодзеж (некаторыя вяскоўцы лічаць, што менавіта там на дне і ляжыць скарб). Верыць мясцовым паданням альбо не — справа індывідуальная, але сапраўднае багацце ў маёнтку ёсць, праўда, яно пераважна духоўнае. Бо тут размяшчаюцца адразу тры ўстановы культуры — Дом культуры, дзіцячая школа мастацтваў і бібліятэка-музей.

Не сакрэт, што песня можа ў розных сітуацыях спрыяць чалавеку. Ансамбль «Сяброўкі» — прыклад таго, як спевы аб'ядналі жанчын у паўсядзённым жыцці, зрабіўшы іх сапраўднымі сяброўкамі. Паколькі калектыў пераважна жаночы, то не дзіўна, што тэматыка ў большасці прадстаўленых песень таксама пра каханне, жаночы лёс з яго радасцямі ці бедамі…

*Цячэ вада, цячэ вада, цячэ на быстрыне.*
*Даўно была, даўно была з мілым*
*на вяселлі.*
*Ой, на што, ой, на што мне ту вадзіцу піці,*
*Ой, як жа мне, ой, як жа мне*
*з мілым гаварыці.*
*Казаў мілы, казаў мілы,*
*што мяне папросіць,*
*Ой, як у полі пры таполі*
*пшанічаньку скосіць.*
*Ой, як доўга яе косіць, ужэ восень мінае,*
*Ён жаніцца бярэ другу, а мяне кідае.*
*Не рві, мілы, не рві, мілы, спелыя маліны,*
*Не кахай ты, не кахай ты зразу*
*дзве дзяўчыны.*
*Дзве дзяўчыны, дзве дзяўчыны,*
*то вяліка здрада.*
*Адна стаіць, горка плача,*
*друга таму рада.*

— Гісторыя нашага калектыву ў першую чаргу звязана з дырэктарам клуба Лідзіяй Колычавай, якая з'яўляецца ініцыятарам стварэння ансамбля. Дзяўчаты, калі прыйшлі ў суполку, прыдумалі назву «Сяброўкі». І вось мы ўжо каторы год разам спяваем, бавім час, сумесна адзначаем розныя святы. Без перабольшання магу сказаць: сталі адной сям'ёй. І вельмі радуемся таму, што наш калектыў дае магчымасць кожнай заставацца маладой, не хварэць і радавацца жыццю, — кажа кіраўнік ансамбля Таццяна Шыбуняева.

А самі ўдзельніцы «Сяброваk» зазначаюць, што на іх памяці без песень ніхто і нікуды не ішоў: і на працу, і з працы, і ў гасцях — усюды бралі яе з сабой. Папаўняць песенны рэпертуар часцей за ўсё імкнуцца распытваючы і слухаючы бабуль, якія памятаюць некаторыя мелодыі ў першасным варыянце і перанялі іх у спадчыну ад былых пакаленняў. Дарэчы, сведчанне таму, што праблема дзяцей і бацькоў існавала ва ўсе часы, можна таксама знайсці ў песнях калектыву:

*Там за лугам зеляненькім*
*Брала ўдова лён драбненькі.*
*Яна брала, выбірала,*
*Тонкі голас падавала.*
*А Васілька сена косіў,*
*Тонкі голас пераносіў:*
*— Пазволь маці ўдову браці,*
*Тады не буду піць-гуляці.*
*— Не пазволю ўдову браці,*
*Удова ўмее чараваці.*
*Счаравала мужа свайго*
*І счаруе сына майго.*
*— А я чараў не баюся*
*І на ўдове ажанюся.*

…Яшчэ да знаёмства з калектывам, пакуль здымачная група настройвала тэхніку, у музеі «Бабін кут», агледзеўшыся навокал, можна было азнаёміцца з прадметамі побыту, пагартаць кнігі фальклорнай тэматыкі, якія тут размешчаны на асобнай палічцы. Усё захоўвае таямніцу свайго часу, людскіх лёсаў з яго звычкамі, патрэбамі…

*Нядоля, нядоля, няшчасце маё,*
*Не любіць свякроўка імення майго.*
*Шле мяне маладу скрозь ноч па ваду.*
*Свякроўка-мамонька, яшчэ раненька:*
*Шчэ пятух не пяяў, гусак не крачаў,*
*Толькі шэры воўк за гарою выў.*

Слухаць гісторыі ў песнях, якія выконваюць жанчыны з ансамбля «Сяброўкі», любяць многія. Таму з канцэртамі мясцовых артыстаў можна сустрэць і на вяселлі, і ў кампаніі камбайнераў перад іх выхадам у поле, а вясной і летам часта адбываюцца гастролі ў санаторый «Лясныя азёры». Нязменны акампаніятар у калектыве — баяніст Фёдар Гайко. Падчас нашай сустрэчы ён то падыгрываў жанчынам, то ўслухоўваўся ў іх шматгалоссе. Калі ж браўся за інструмент — песні адразу набывалі яшчэ больш каларытнае гучанне.

*Ці я не хазяйка, ці не гаспадыня?*
*Тыдзень хаты не мяла, печы не тапіла.*
*Як паехаў мужанёк ды ў поле араці,*
*А я выйшла на вуліцу з хлопцамі стаяці.*
*Едуць людзі ў поле і з мяне смяюцца,*
*Што на маіх падушках вораны нясуцца.*
*Ой, не бойцесь, людзі, неяк яно будзе:*
*Аскубаю вараня ды перына будзе.*
*Не дзявуйся, мужанёк, з такой гаспадыні,*
*Трэба было дзіваваццa,*
*як была дзяўчынай.*

Жарты жартамі, а задумацца пасля такіх песень кожнаму не лішнім будзе. Нездарма кажуць: з песні слова не выкінеш.

**Алена ДРАПКО.**

## «ПЕСНЯРЫ» АДКРЫЮЦЬ ДЗІЦЯЧАЕ ШОУ ТАЛЕНТАЎ

**Тэлеканал АНТ распачынае паказ пятага сезона шоу «Я спяваю». У першым канцэрце ўдзельнікі выканаюць вядомыя хіты мінулага, сярод якіх «Алеся», «Вологда», «За полчаса до весны» і шэраг іншых. Разам з юнымі артыстамі на сцэну выйдуць салісты ансамбля «Песняры», а таксама Юзары, «Харошкі», «Камерата».**

Ацэньваць удзельнікаў пятага сезона на кожным канцэрце будуць суддзі Іскуі Абалян (спявачка, мама і ўдзельніца дзіцячых дабрачынных акцый), Наталі Баяра (вакалістка гурта «Scorpions», уладальніца прэміі «Джазавы Оскар Беларусі», удзельніца мюзікла «Прарок») і кампазітар, аранжыроўшчык, фіналіст конкурсу «Еўрабачанне-2014» Тэа. А суправаджаць на сцэне і падтрымліваць канкурсантаў будзе нязменны вядучы шоу «Я спяваю», рэжысёр тэатра і кіно, бацька шасцярых дзяцей Дзмітрый Астрахан. Таксама з хлопчыкамі і дзяўчатамі побач увесь час знаходзіцца музычны кіраўнік праекта Святлана Стацэнка.

Ужо 14 лютага вы зможаце ўбачыць дзесяць нумароў у выкананні ўдзельнікаў праекта, пачуць ацэнку выступленняў і парады юным артыстам ад суддзяў. Таксама падчас эфіру тэлегледачы змогуць аддаць свой голас за аднаго з канкурсантаў. Вынікі галасавання будуць агучаны ў ранішнім эфіры праграмы «Наша раніца» 18 лютага. Сродкі, якія тэлеканал АНТ атрымае ў выніку галасавання, будуць накіраваны ў дзяржаўную ўстанову «Рэспубліканскі навуковы цэнтр дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі».

Не застануцца без увагі і гісторыі жыцця ўсіх дзесяці дзяцей. Карэспандэнты АНТ прадставяць сюжэты пра тое, якім шляхам кожны з іх ішоў да запаветнага дня, калі трапіў у праект «Я спяваю», і як пераадольваў выпрабаванні на шоу.

## «МАШЫНА ЧАСУ» РУШЫЦЬ НА ПОЛАЧЧЫНУ

**У найбліжэйшых выпусках (15 і 22 лютага) разам з праграмай «Наперад у мінулае» гледачы тэлеканала «Беларусь 3» змогуць здзейсніць падарожжа на Полаччыну. Так, у гэту нядзелю будзем знаёміцца з ансамблем народнай песні і музыкі «Сяброўкі», што з вёскі Блізніца Полацкага раёна. А ў апошнюю нядзелю зімы завітаем у госці да народнага гурта архаічных спеваў «Княжыч» з Наваполацка.**



Кожны з гэтых калектываў па-свойму адметны. Напрыклад, удзельнікі народнага гурта архаічных спеваў «Княжыч» з Наваполацка — у большасці сваёй маладыя і таленавітыя людзі. Тут нават дзетак з юнага ўзросту заахвочваюць да спеваў уласным прыкладам. Узнік калектыў у 1995 годзе. Першапачаткова ён быў сфарміраваны з выкладчыкаў і студэнтаў полацкага гістарычнага факультэта. Сёння засталіся адзінкі з тых, хто ў гурце ад першых гадоў існавання. Манеру спеву, якую сёння нячаста сустрэнеш, пераймалі па запісах на касетах. І цяпер дзеляцца сваімі песеннымі набыткамі з іншымі на святочных гуляннях, фэстах сярэднявечнай культуры… Як прызнаюцца маладыя людзі, сакрэт прыгожых спеваў просты — яны гэтай справай жывуць. Самі нават робяць свае строі: плятуць паясы, шыюць кашулі, прытрымліваючыся традыцыйных арнаментаў і колераў.

22 лютага ў гледачоў будзе ўнікальная магчымасць пачуць песні не толькі ў выкананні калектыву, але і ў сучаснай апрацоўцы спевака Аляксея Хлястова. Таксама зможаце ўспомніць альбо адкрыць для сябе гісторыю, легенды, паданні і традыцыі гэтай мясцовасці. Глядзіце праграму 22 лютага.

А 15 лютага не прапусціце фальклорную вандроўку ў кампаніі з ансамблем народнай музыкі і песні «Сяброўкі». Вас таксама будзе чакаць прыемны сюрпрыз — новая арыгінальная версія аўтэнтычнай песні ў выкананні ансамбля «Чараўніцы».

**Алена ДРАПКО.**

## ■ Тэлесеткі

### Хто на новенькую?

**У праграме «Добрай раніцы, Беларусь!», кажучы мовай спартыўных каментатараў, адбылася замена на полі. Цяпер у пары з Канстанцінам Прыдыбайлам будзіць гледачоў і дае зарад бадзёрасці папулярная спявачка Дарыя. Яна замяніла ў гэтым тандэме тэлевядучую Ксенію Дзюкаву, якая днямі сышла ў дэкрэтны водпуск.**



— Для мяне праца ў ранішнім тэлевізійным эфіры — гэта зусім новы і такі цікавы вопыт! — не хавае эмоцый Дарыя. — І хоць па натуры я «сава», але калі трэба для справы і працы — магу наогул не класціся спаць. Калі шчыра, адчуваю сябе першакласніцай, якая мала што ведае і адчувае пэўную нервовасць, але вельмі хоча вучыцца! Мне гэта насамрэч цікава і не хочацца падвесці людзей, якія ў мяне паверылі.

Іншыя ранішнія тэледуэты — Святлана Бароўская і Дзяніс Дудзінскі, Вольга Мядзведзева і Глеб Давыдаў, Вольга Рыжыкава і Яўген Перлін, Надзея Цімафеева і Сцяпан Гутнікаў — засталіся нязменнымі.

### Японская эмансіпацыя... на беларускай мове!

**Яшчэ ў мінулым годзе ў нашай краіне адбыўся шэраг мерапрыемстваў, прысвечаных знакавай даце ў гісторыі беларуска-японскіх стасункаў — 200-м угодкам з дня нараджэння беларуса Іосіфа Гашкевіча, які стаў першым консулам Расійскай імперыі ў Японіі, а таксама аўтарам першага ў свеце японска-рускага слоўніка. Сёлета сумесныя праекты атрымалі працяг: на культуралагічным канале «Беларусь 3» стартаваў прэм'ерны паказ японскай мастацкай шматсерыйнай стужкі «Гваздзік». Фільм, які, дарэчы, заснаваны на рэальных падзеях, спецыяльна па замове тэлеканала дубліраваны па-беларуску.**



Як адзначыў пасол Японіі ў Рэспубліцы Беларусь Сігэхіра Міморы, гэта першая тэлевізійная праграма японскай вытворчасці ў беларускім эфіры. «Чалавечыя пачуцці — агульныя для ўсіх народаў, таму я перакананы, што фільм «Гваздзік» спадабаецца і вашым гледачам», — адзначыў пасол.

Мастацкі фільм распавядае пра жыццё Аякі Касіны (у серыяле Ітока Ахара) — жанчыны-дызайнера, піянера ў свеце японскай моды, маці трох дачок, якія пазней таксама сталі знакамітымі ў гэтай сферы. Гэта незвычайная жанчына нарадзілася ў Краіне Узыходзячага Сонца напачатку мінулага стагоддзя, у тыя часы, калі японскія жанчыны былі вельмі абмежаваныя ў выбары магчымай дзейнасці. Але гераіня змагла разбурыць сістэму, пабудаваць сваё жыццё па ўласным сцэнары і дасягнуць поспеху...

У Японіі серыял «Гваздзік» упершыню быў паказаны ў кастрычніку 2011 — сакавіку 2012 гг. і стаў, па водле рэйтынгаў, вельмі папулярным у гледачоў.

Беларускія гледачы могуць сачыць за перыпетыямі серыяла ў дзённым эфіры па будных, з панядзелка да пятніцы.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК** ■

## ПАНЯДЗЕЛАК, 16 ЛЮТАГА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.35** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 0.20** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05** Клуб рэдактараў.
**10.40, 20.00 Серыял «Выходжу цябе шукаць 2».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.45 Камедыя «Сем старых і адна дзяўчына».**
**13.30 Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць».**
**15.10, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.40 Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... Зноў».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**21.00** Панарама.
**21.40** Форум.
**22.40 Серыял «След».**
**0.55** Дзень спорту.
**1.05 Трагікамедыя «Гульня ў праўду».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 10.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 16.50 Баявік «Кулінар».**
**10.35** «Зразумець і абясшкодзіць».
**11.10 Фільм-катастрофа «Някіруемы».**
**12.55 Баявік «Гадзіла».**
**15.10** Ікра.
**15.45** «Comedy Батл». Без межаў».
**16.45** Хачу ў тэлевізар!
**17.55, 0.00 Серыял «Каханне на раёне».**
**18.55 Серыял «Інтэрны».**
**19.55** «Хачу ў тэлевізар».
**20.20 Серыял «Як я сустрэў вашу маму». 1-я серыя.**
**20.50** Рэальны свет.
**21.25** КЕНО.
**21.30 Дэтэктыў «Падмані мяне».**
**23.10 Фэнтэзі «Усёмагутныя Джонсаны».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.10** «Дабраранак».
**7.45** «Хачу ўсё ведаць!».
**7.55, 17.30** «Дыя@блог P.S.».
**8.20 «Новы кінатэатр «Парадзіза». Драма.**
**10.20** «Культпрасвет».
**10.55 «Зусім прапашчы». Прыгодніцкі фільм.**
**12.30 «Маёр «Віхар». Маст. фільм. 1-я — 3-я серыі.**
**16.05** «Камертон». Народны артыст БССР Генадзь Гарбук.
**16.30** «Гэты дзіўны свет...». Чэслаў Немен. Дак. фільм.
**17.00 «Гваздзік». Драма.**
**18.00 «Бяляначка і Розачка». Фільм-казка.**
**19.05 «Лермантаў». Драма.**
**20.45** «Калыханка».
**21.05** Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».
**21.55** «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
**22.25** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**22.55** «Подых струн». Музычная праграма. Госць — Мацвей Мантвалінскі.

### БЕЛАРУСЬ 5

**4.35, 20.00** Баскетбол. НБА. Матч зорак.
**7.05, 1.05** PRO спорт. Навіны.
**7.55** Баскетбол. Адзіная ліга ВТБ. «Цмокі-Мінск» — «Німбурк».
**9.35** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. ПСЖ (Францыя) — «БГК імя Мяшкова» (Беларусь).
**11.00** Тэніс. Турнір ВТА. Дубай.
**22.35** Біятлон. Этап Кубка свету. Халменколен. Эстафета. Жанчыны.
**0.10** Еўрапейскі покерны тур.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.15** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік. «Дзеці Камінтэрна. Выратаваныя ў Беларусі».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** «Справа прынцыпу».
**22.15** Канцэрт «Felicita».
**23.30 Маст. фільм «Прыватнае жыццё Піпы Лі».**
**1.05** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.50** «Вялікае снеданне».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.25** «Такі лёс».
**15.10** «Далёкія сваякі».
**15.40** «Ежа багоў».
**16.50 Серыял «Вовачка».**
**18.35** «Дакументальны праект»: «Па загадзе багоў».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15** «Ваенная тайна».
**23.00** «Тыдзень спорту».

**23.30 Трылер «4:44. Апошні дзень на Зямлі».**



**0.50** «Дакументальны праект»: «Страчаны дар продкаў», «Калі Зямля злуецца».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Беларусь сёння».
**9.30 Маст. фільм «Дабрыня».**
**11.05 Маст. фільм «Кароль, дама, валет».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20 Серыял «Дарогі Індыі».**
**15.05 Дак. серыял «У свеце ежы».**
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Рускі шакалад».**
**19.25 Серыял «Другое жыццё Фёдара Строгава».**
**21.10 Серыял «Група «Зэта».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
**1.30** Прафілактыка.

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Уся Расія».
**11.50** «Фокус покус. Чарадзейныя тайны».
**12.50** «Пакой смеху».
**13.50, 16.50, 19.50, 22.45** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.30** «Прамы эфір».
**17.10** «Асаблівы выпадак».
**18.00 Серыял «Варажба пры свечках».**
**18.55 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.55 Маст. фільм «Каханне на сене».**
**22.55** «Хуліа Іглесіяс. Жыццё працягваецца».
**23.45 Серыял «Каменская».**

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.05** «Справа ўрачоў».
**9.00, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Ядзім дома».
**14.50, 22.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.10** «Пракурорская праверка».
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.45 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».**
**21.25, 23.35 Серыял «Пятля».**
**22.45** «Анатомія дня».
**0.25 Серыял «Пятніцкі».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 13.35, 19.50, 20.55, 23.25** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.20** «Сёння клюе».
**7.50, 19.55 Серыял «Па той бок ваўкоў».**
**8.45** «Кінаблакнот».
**9.00 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**10.00 Прыгоды «Джуманджы».**
**11.45 Баявік «Два ствалы».**
**13.40 Серыял «Чарцяня».**
**15.15, 19.35** «Хатняя крама».
**16.30** «Золата маўчання».
**17.00 Серыял «Іх перабльталі ў раддоме».**
**18.30 Серыял «Высакародная жанчына».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Драма «Амерыканская рапсодыя».**
**23.00 Серыял «Прыгарад».**
**23.30** «Хобі TV».

---

### ВТБ

**6.00, 4.00** "PLAY".
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00, 17.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00** «Я падаю на развод».
**10.00, 19.00** Серыял «Анжаліка».
**11.00, 18.00** Серыял «Кухня».
**12.00** Меладрама «Сэрцаедкі».
**14.30, 17.30** «Лаві момант».
**15.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».
**16.00, 3.00** «Маё вяселле лепшае!».
**20.00** Сітком «Сямейны бізнес».
**21.10** Драма «Прыгоды на Багамах».
**23.05** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**0.00** «Дурні і дарогі».
**1.00** Серыял «Зачараваныя».

### КУЛЬТУРА

**7.00** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.00** Навіны культуры.
**10.15** «Наглядальнік».
**11.15** Маст. фільм «Маскарад».
**13.00** «Лінія жыцця». Уладзімір Рэцэпцер.
**13.55** «Казкі з гліны і дрэва». Дымкаўская цацка.
**14.05, 1.40** Серыял «Пецярбургскія тайны».
**15.10** «А. Пушкін. «Яўгеній Анегін».
**15.40** Маст. фільм «Дваццаць дзён без вайны».
**17.20** Дак. фільм «Неразгаданая тайна».
**18.00, 22.00, 2.35** «Сусветныя скарбы культуры».
**18.15** Дак. фільм «Фантазія на тэму актрысы без амплуа. Лідзія Сухарэўская».
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** «Сацы. Нясумная класіка...».
**20.10** «Правілы жыцця».
**20.40** «Добрай ночы, малыя!».
**20.50** «Тым часам».
**21.35** Дак. фільм «Полк, смірна!».
**22.15** 95 гадоў з дня нараджэння Міхаіла Швейцэра. «Астравы».
**23.20** Маст. фільм «Маленькія трагедыі». 1-я серыя.
**0.50** «П'едэстал прыгажосці. Гісторыя абутку з Рэнатай Літвінавай». Фільм 1-ы.
**1.20** Ф. Шуберт. Саната ля мажор.

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00, 0.00** «У асяроддзі сяброў. Вас запрашае Эльдар Разанаў». 1986 год.
**7.00** «Ранішняя пошта». 1986 год.
**7.40** «Вакол смеху». 1981 год.
**9.00** «ТБ-дыскатэка». 1986 год.
**9.50, 15.45** Маст. фільм «Адам жэніцца з Евай».
**11.00, 16.55** «Залаты дыск-90». Канцэрт з удзелам В. Дабрыніна. 1991 год.
**12.00** «Пакуль усе дома». У гасцях у Таццяны Шмыгі. 1994 год.
**12.30** Часопіс «Московский наблюдатель». Сустрэчы на Арбаце». 1992 год.
**13.35** «Музычны клуб-1». 1991 год.
**14.40** Дак. фільм «Сны Ігара Талькова».
**18.00** «Марафон-15 — малым». 1993 год.
**18.30** Дак. фільм «Лідзія Русланава». 1-я серыя.
**19.40** Тэлеспектакль «Марцін Ідэн». 1-я серыя. 1976 год.
**20.40** Канцэрт замежнай эстрады.
**21.00, 3.00** Праграма «Час».
**22.00** «Народжаныя ў СССР».
**23.00** «Песня-74».
**1.15** Фільм-канцэрт «Музычны круіз». 1994 год.
**1.45** Тэлефільм «Следства вядуць знатакі». 1988 год.
**4.00** «Колба часу».
**5.00** Праграма «Погляд». 1989 год. 1-я частка.

### EUROSPORT

**10.30** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету. Мужчыны.
**11.00** Біятлон. Кубак свету. Жанчыны.
**11.45, 1.45** Біятлон. Кубак свету. Мужчыны.
**12.30, 2.45** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету.
**13.30, 2.00** Снукер. Welsh Open.
**20.00, 1.00** Футбол. Еўрагалы.
**20.45** Горныя лыжы. Чэмпіянат свету.
**21.45** WATTS.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 3.10** Серыял «Былья».
**6.45** Камедыя «Маё вялікае грэчаскае лета».
**8.25** Камедыя «Дарагая, мы паменшылі сябе».
**9.35, 14.25, 15.15, 20.00, 21.45, 22.45, 2.50, 5.35** Скетчком «Паміж намі».
**10.40** Камедыя «Каханне без перасадак».
**12.15** Камедыя «Алмазны сабака».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Прыгоды «Дарога ў Занзібар».
**17.30, 22.00** Серыял «Пакетная здзелка».
**18.20** Камедыя «Закаханы скнара».
**20.20** Камедыя «Закаханы і бяззбройны».
**23.10** Камедыя «Учора, сёння, заўтра».
**1.15** Камедыя «Утаймаванне свавольных».
**4.00** Камедыя «Круты татачка».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.40** «Доктар І...».
**8.10, 18.50, 2.00** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**9.50, 4.25** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.35, 17.55** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.25, 17.00** Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
**13.20** Маст. фільм «Пікап. Здым без правілаў».
**14.40** «Сто пытанняў даросламу».
**15.30, 22.40, 3.40** «Зорныя гісторыі».
**16.30, 3.15** «Нераскрытыя тайны».
**20.45** Серыял «Пошукі доказаў».
**21.45, 1.15** Серыял «Катоўскі».
**23.35** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
**0.20** «Часова даступны».
**5.15** Серыял «Аўрора».

### ТБ1000

**6.00, 14.30** Камедыя «Хлопчыкам гэта падабаецца».
**8.00** Драма «Рэйчал выходзіць замуж».
**10.00** Драма «Буш».
**12.15** Драма «Розум і пачуцці».
**16.15** Трылер «Добры доктар».
**18.00** Камедыя «Дзеці сексу не перашкода».
**20.00** Драма «Разня».
**21.30** Камедыя «Імоджэн».
**23.30** Камедыя «Экзамен для дваіх».
**1.30** Драма «Сапраўдная каштоўнасці».
**4.00** Камедыя «Вяселле майго лепшага сябра».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Камедыя «Палярны рэйс».
**8.00** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе».
**9.30** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 2».
**11.00** Камедыя «Каханне ў вялікім горадзе 3».
**12.30** Камедыя «Набожная Марта».
**15.10** Драма «Нябесны суд».
**16.50, 18.40** Драма «Нябесны суд. Працяг».
**20.20** Камедыя «Аднакласнікі. ru: НаCLICKай удачу».
**22.00** Камедыя «Дзень грошай».
**23.50** Драма «Легенда №17».
**2.10** Трагікамедыя «Кококо».
**3.40** Трагікамедыя «Нябесныя ластаўкі».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Мегазаводы.
**6.45, 12.40, 18.45, 22.55, 2.40, 5.40** Зрабі або памры.
**7.30, 13.25, 19.10, 22.30, 2.15, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55, 13.50** Кіраванне натоўпам.
**8.15, 21.45, 1.30, 4.30** Расследаванні авіякатастроф.
**9.40, 14.10, 19.30** Абаронцы культурной спадчыны.
**10.25, 14.55, 20.15** Прызнанні нацыстаў.
**11.10** Машыны: разабраць і прадаць.
**11.55** Золата Юкана.
**15.45** Кальмар супраць кашалота.
**16.30** Дзікія жывёлы Поўначы.
**17.15** Сутыкненне з астэроідам.
**18.00, 3.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**21.00, 0.45, 3.45** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**23.15** Турэмныя цяжкасці.
**0.00** Паранармальнае.

### DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Разбуральнікі легенд.
**9.40, 13.50** У пагоні за класікай.
**12.10, 18.00** Паляўнічыя на склады.
**13.00, 22.10, 7.05** Голыя і напалоханыя.
**14.40, 6.05** Што было далей?
**16.20, 19.40, 4.25** Хуткія і гучныя.
**17.10, 5.15** Махінатары: пяцёрка лепшых.
**18.50** Мяцежнікі ледзянога возера.
**20.30** Эфект Карбанара.
**23.00** Востраў.
**23.50** Гульня на жыццё.
**0.40, 3.35** Паляўнічыя на рэліквіі.
**1.30** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.

# СЕРАДА, 18 ЛЮТАГА

## БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**8.50** Слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на Попельную сераду. Пачатак Вялікага посту.
**9.15, 22.00 Серыял «След».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 19.55 Серыял «Выходжу цябе шукаць 2».**
**12.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Адвакатэсы».**
**15.10, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.50 Серыял «Сваты 6».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.35** Дзень спорту.

## БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 16.50 Баявік «Кулі-нар-2».**
**10.05** Беларуская кухня.
**10.40, 21.35 Дэтэктыў «Падмані мяне».**
**11.35 Камедыя «Чалавек з бульвара Капуцынак».**
**14.00, 18.55 Серыял «Інтэрны».**
**15.25, 20.15 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**15.55** Рэпарцёр.
**17.55 Серыял «Каханне на раёне».**
**20.45** Рэальны свет.
**21.25** Спортлато 5 з 36.
**21.30** КЕНО.
**22.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. «Базель» — «Порту».
**0.40** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Агляд.
**1.05 Фэнтэзі «Усёмагутныя Джонсаны».**

## БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.00, 19.40** «Размовы пра духоўнае».
**8.10, 18.30 Серыял «Робін з Шэрвуда».**
**9.00, 10.15 «Канвой PQ 17». Драма. 1-я — 3-я серыі.**
**9.50, 19.15** «Дыя@блог». «Пра мову».
**12.10, 23.25** «Святло далёкай зоркі». Памяці заслужанай артысткі Беларусі Галіны Бальчэўскай.
**12.40** «Навукаманія». Праз церні да зорак.
**13.05** С. Картэс. «Візіт дамы». Спектакль Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі.
**14.35** «Плошча мастацтваў». Сяргей Картэс.
**15.05** «Далёкі Усход: утаймаванне стыхіі». Дак. фільм.
**15.30** «Тысячагадовае Заслаўе». Дак. фільм.
**15.55** «Наперад у мінулае».
**16.25** «Квенцін Таранціна. Прафесійны кінахуліган». Дак. фільм.
**17.05** «Рэчавы доказ». «Мы былі». Дак. фільм.
**17.30** «Рэчавы доказ». «Апрычнік і Шэкспір». Дак. фільм.
**17.55 «Гваздзік». Драма.**
**19.50, 21.15, 22.35 «Канвой PQ 17». Драма.**
**20.45** Калыханка.
**21.05** «Нябачны фронт». Лендліз. Дак. фільм.
**22.10** «Дыя@блог». «Пра прыгожае».

## БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 2.25** PRO спорт. Навіны.
**7.45** Козел пра футбол.
**8.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. «Шахцёр» (Украіна) — «Баварыя» (Германія).
**9.55, 17.10** Біятлон. Маладзёжны чэмпіянат свету ў Раўбічах. Індывідуальная гонка. Дзяўчаты.
**11.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. ПСЖ (Францыя) — «Чэлсі» (Англія).
**13.30** Біятлон. Маладзёжны чэмпіянат свету ў Раўбічах. Індывідуальная гонка. Юнакі.
**15.20, 21.10** Тэніс. Турнір ВТА. Дубай.
**18.55** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) — СКА (Санкт-Пецярбург).
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. «Шальке 04» (Германія) — «Рэал» (Іспанія).
**0.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. «Базель» (Швейцарыя) — «Порту» (Партугалія).

## АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.15** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Аднакласнікі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Стрэл».**
**23.05 Серыял «Анёл або дэман».**
**0.00** «ВячэрніУргант».
**0.35** Начныя навіны.

## СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Трылер «Мішэль Вальян: прага хуткасці».**
**10.15** «Глядзець усім!».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50, 0.10 Серыял «Фірменная гісторыя».**
**15.40** «Ежа багоў».
**16.50 Серыял «Вовачка».**
**18.35** «Нам і не снілася»: «Усе тайны палацавых пераваротаў».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Школа зладзеяў. Частка другая».**
**22.00** «Глядзець усім!».
**23.00** «Гарачы лёд».
**23.20** «Сакрэтныя тэрыторыі».

## МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Зроблена ў СССР».
**9.30, 1.30 Маст. фільм «Па шчасце».**
**10.50 Маст. фільм «Наслан-нё».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 3.45 Серыял «Дарогі Індыі».**
**15.05, 2.50** Дак. серыял «Прыгажосць на заказ».
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Рускі шакалад».**
**19.25 Маст. фільм «Скульптар смерці».**
**21.10 Серыял «Марскі патруль».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.

## РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Уся Расія».
**11.50** «Золата інкаў».
**12.50 Серыял «Каменская».**
**13.50, 16.50, 19.50, 22.45** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.30** «Прамы эфір».
**17.10** «Асаблівы выпадак».
**18.00 Серыял «Варажба пры свечках».**
**18.55 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.55, 22.55 Серыял «Ліквідацыя».**
**0.45** «Спецыяльны карэспандэнт».

## НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.05** «Справа ўрачоў».
**9.00, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Справа густу».
**14.45, 22.20** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.10** «Пракурорская праверка».
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.45 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».**
**21.25, 23.35 Серыял «Пятля».**
**22.45** «Анатомія дня».

## 8 КАНАЛ

**7.00, 13.35, 19.50, 20.55, 23.35** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.30, 19.55 Серыял «Ключы ад бездані».**
**8.20, 18.30 Серыял «Высакародная жанчына».**
**9.20, 13.20** «Кінаблакнот».
**9.30 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**10.30** «Адшукваецца адпачынак».
**11.00 Драма «Апакаліпсіс».**
**13.40 Серыял «Чарцяня».**
**15.15, 19.35** «Хатняя крама».
**16.30** «Золата маўчання».
**17.00 Серыял «Іх перабльтаілі ў раддоме».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Трылер «Сапфіравая кніга».**
**23.10 Серыял «Прыгарад».**
**23.40** «Хобі TV».

## ВТБ

**6.00, 4.00** «PLAY».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00, 17.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 20.00** Сітком «Сямейны бізнес».
**10.00, 19.00** Серыял «Анжаліка».
**11.00, 18.00** Серыял «Кухня».
**12.00** Меладрама «Замерзлая з Маямі».
**13.50, 23.05** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.30, 17.30** «Лаві момант».
**15.00, 1.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».
**16.00, 3.00** «Маё вяселле лепшае!».
**21.10** Фэнтэзі «Кроў і шакалад».
**0.00** «Дурні і дарогі».

## КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.00** Навіны культуры.
**10.15** «Наглядальнік».
**11.15, 23.20** Маст. фільм «Маленькія трагедыі».
**12.30** «Сусветныя скарбы культуры».
**12.45** «Красуйся, горад Пятроў!». Дойлід Росі.
**13.10, 20.10** «Правілы жыцця».
**13.35, 0.35** «П'едэстал прыгажосці. Гісторыя абутку з Рэнатай Літвінавай».
**14.05, 1.55** Серыял «Пецярбургскія тайны».
**15.10** «А. Пушкін. «Яўгеній Анегін».
**15.40** Штучны адбор.
**16.20** «Больш, чым каханне». Агата Крысці.
**17.00** «Хлеб і Грошы». Дакументальны праект.
**17.40** Успамінаючы вялікай спявачку. Алена Абразцова і Важа Чачава.
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** «Абсалютны слых».
**20.40** «Добрай ночы, малыя!».
**20.55** 80 гадоў Генадзю Гладкову. Дак. фільм «Звычайны чараўнік».
**21.20** Дак. фільм «Неферціці».
**21.30** Дак. фільм «История Семеновского полка, или Небываемое бываеть».
**22.15** Улада факта. «Грошы ў гісторыі».
**1.05** Алена Абразцова і Альгіс Журайціс. Арыі з опер.
**2.50** Дак. фільм «Анарэ дэ Бальзак».

## НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** «Марафон-15 — малым». 1993 год.
**6.30, 12.25** Дак. фільм «Лідзія Русланава».
**7.40, 13.35, 19.45** Тэлеспектакль «Марцін Ідэн». 1976 год.
**8.40, 19.25** Канцэрт замежнай эстрады.
**9.00, 15.00, 21.00** Праграма «Час».
**10.00, 16.00, 22.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.00** «Песня-74».
**12.00** Канцэрт «ВІА «Арызонт». 1982 год.
**14.40** Фільм-канцэрт «Песні Аляксандры Пахмутавай». 1977 год.
**17.00, 23.00** «Жадаем Вам...». 1985 год.
**18.00** Дак. фільм «Падарожжа па Маскве». «Па вуліцах старых, запаведных».
**18.25** Фільм-канцэрт «Білі Джоэл у Маскве». 1987 год.
**19.00** «Нам дарогі гэтыя забываць нельга». Вершы Міхаіла Святлова чытае Міхаіл Ножкін. 1985 год.
**0.00** «Пакуль усе дома». У гасцях у Таццяны Шмыгі. 1994 год.
**0.30** Часопіс «Московский наблюдатель». Сустрэчы на Арбаце». 1992 год.
**1.35** «Музычны клуб-1». 1991 год.
**2.40** Дак. фільм «Сны Ігара Талькова».
**3.45** Маст. фільм «Адам жэніцца з Евай». 2-я серыя.
**4.55** «Залаты дыск-90». Канцэрт з удзелам В. Дабрыніна. 1991 год. 2-я частка.

## EUROSPORT

**10.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Турнэ 4-х трамплінаў.
**11.30** Футбол. 1/8 фіналу. «Рэал Мадрыд» (Іспанія) — «Порту» (Партугалія).
**13.00, 20.30** Снукер. Welsh Open.
**15.00** WATTS.
**15.15** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету.
**18.30, 2.35** Веласпорт.
**20.00, 1.05** All Sports.
**1.00, 2.25** Выбранае па серадах.
**1.10** Навіны коннага спорту.
**1.15** Гольф. Тур PGA.
**2.15** Гольф-клуб.
**2.20** Яхт-клуб.

## КАМЕДЫЯ

*6.00 Прафілактыка.*
**10.00, 17.30, 22.00** Серыял «Пакетная здзелка».
**10.35** Камедыя «Учора, сёння, заўтра».
**12.30** Камедыя «Закаханы і бяззбройны».
**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (Шоу)».
**14.25, 15.15, 20.00, 21.45, 22.45, 0.40, 2.50, 5.35** Скетчком «Паміж намі».
**16.00** Камедыя «Пра што маўчаць дзяўчаты».
**18.20** Дэтэктыў «Высокі бландзін у чорным чаравіку».
**20.20** Камедыя «А калі гэта каханне?».
**23.10** Камедыя «Карсіканец».
**1.15** Прыгоды «Дарога ў Занзібар».
**3.10** Серыял «Былыя».
**4.00** Камедыя «Каханне без перасадак».

## ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.35** «Доктар I...».
**8.05, 18.50, 1.40** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**9.45, 3.40** Дак. серыял «Па справах нязноўнагадовых».
**11.30, 17.55** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.25, 17.00** Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
**13.20, 20.50** Серыял «Пошукі доказаў».
**14.15** «Простыя складанасці».
**14.45, 0.10** Серыял «Каменская».
**15.35, 22.35** «Зорныя гісторыі».
**16.30, 3.15** «Нераскрытыя тайны».
**21.45, 0.55** Серыял «Катоўскі».
**23.25** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
**5.15** Серыял «Аўрора».

## TV 1000 ТБ1000

**6.00** Баявік «Машына часу».
**8.00, 4.30** Драма «Сапраўдныя каштоўнасці».
**10.30, 16.25** Драма «Рэйчал выходзіць замуж».
**12.30** Баявік «Кілеры».
**14.30** Камедыя «Імоджэн».
**18.15** Камедыя «Хлопчыкам гэта падабаецца».
**20.00** Фантастыка «Дывергент».
**22.20** Баявік «Галодныя гульні».
**0.45** Трылер «Добры доктар».
**2.15** Драма «Некалькі добрых хлопцаў».

## ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.20** Фільм-казка «Прынцэса на гарошыне».
**7.50** Меладрама «Жаніх па аб'яве».
**9.30** Камедыя «Пісталет Страдывары».
**11.00** Драма «Я таксама хачу».
**12.30** Трагікамедыя «Адзінокая жанчына жадае пазнаёміцца».
**14.00** Фэнтэзі «Казка. Ёсць».
**15.30** Прыгоды «1812: Уланская балада».
**17.10** Камедыя «Дванаццаць месяцаў».
**18.50** Камедыя «На здрадзе».
**20.20** Камедыя «Вечнае вяртанне».
**22.10** Драма «Збавенне».
**00.10** Драма «Забава».
**1.40** Камедыя «М+Ж».
**3.20** Камедыя «Калачы».
**4.50** Камедыя «Сябры сяброў».

## NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Мегазаводы.
**6.45, 12.40, 18.45, 22.55, 2.40, 5.40** Зрабі або памры.
**7.30, 10.25, 13.25, 14.55, 19.10, 20.15, 21.45, 1.30, 4.30** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55** Кіраванне натоўпам.
**8.15** Міжнародны аэрапорт Дубай.
**8.55** Расследаванні авіякатастроф.
**9.40, 14.10, 19.30** Папулярная навука.
**11.10, 21.00, 0.45, 3.45** Машыны: разабраць і прадаць.
**11.55** Золата Юкана.
**13.50** Гульні розуму.
**15.45** Народжаны поўзаць — лётаць можа!
**16.30** Дзікія жывёлы Поўначы.
**17.15** Падземны свет мая.
**18.00, 3.00** Суперзбудаванні Трэўгга рэйха.
**23.15** Мяжа.
**0.00** Эвакуацыя Зямлі.

## DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Скрыўленне часу.
**9.40, 13.50** Мяцежны гараж.
**12.10, 18.00, 22.10** Бітвы за кантэйнеры.
**13.00, 7.05** Выжыць разам.
**14.40, 6.05** Не спрабуйце паўтарыць.
**16.20, 4.25** Пятая перадача.
**17.10, 5.15** Махінатары: пяцёрка лепшых.
**18.50** Мотабітва.
**19.40** Геній аўтадызайну.
**20.30** Майстэрня «Фантом Уоркс».
**23.00** Бітва за нерухомасць.
**23.50** Склады.
**0.40, 3.35** Багажныя войны.
**1.30** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.

## Гараскоп на



**АВЕН.** Тыдзень запатрабуе рашучых дзеянняў. Нельга застойвацца і доўга разважаць, узважваць і мяняць, бо ў адваротным выпадку вы проста ўпусціце шанц. Гэта добры час для таго, каб прыняць рашэнне і без ваганняў пачаць яго рэалізоўваць. Вас чакае фінансавы поспех і прасоўванне па службе. Добра заключаць здзелкі і дамовы, асабліва калі для гэтага трэба куды-небудзь паехаць. Наогул, паездкі тыдня сустракаюцца спрыяльна, а вось для адносін час не вельмі добры.



**ЦЯЛЕЦ.** Эмацыянальны стан у заняпадзе — адносіны з блізкімі ідуць зусім не так, як хацелася б, магчыма расчараванне і пачуццё адзіноты. Гэты час добра прысвяціць якім-небудзь бягучым справам, каб адцягнуць сваю ўвагу ад цяжкіх думак. Звядзіце кантакты з іншымі людзьмі да мінімуму як у асабістым жыцці, так і ў справах, бо ёсць высокая рызыка таго, што вы не зможаце зразумець адзін аднаго і суладнай працы не атрымаецца. Асцерагайцеся рознага кшталту падманаў, плётак і агаворак асабліва ў канцы тыдня.



**БЛІЗНЯТЫ.** Тыдзень паспяховы ў справах, звязаных з фінансамі. Гэта спрыяльны час для прыняцця рашэння, укладання сваіх сродкаў і сіл, новых пачынанняў. Калі ў вас ёсць нейкія задумкі, якія вы не вырашаліся ажыццявіць, то цяпер самы падыходны час для гэтага. Перад вамі адкрываюцца ўсе неабходныя магчымасці і, самае галоўнае, упэўненасць ва ўласных сілах. У асабістым жыцці гэта перыяд спакою і гармоніі, калі вы можаце разлічваць на сваю другую палоўку, але пры гэтым лепш не ўцягвацца ні ў якія справы без патрэбы.



**РАК.** Будзьце асцярожныя пры прыняцці рашэнняў і выказванні свайго меркавання. Вельмі шмат каму можа быць не да душы тое, што вы запланавалі або што вы робіце, таму могуць з'явіцца сапернікі. Давядзецца пазмагацца за ідэалы і магчымасць развівацца. Старайцеся не чапляцца за мінулае, чымсьці ўсё роўна давядзецца ахвяраваць, а штосьці вам проста замінае. У выніку будзеце вымушаны расстацца з ідэямі або каштоўнасцямі, якія не дазваляюць супакоіцца і рухацца далей. Сітуацыя наладзіцца да канца тыдня.



**ЛЕЎ.** Унутры наспявае жаданне рушыць да новай мэты, штосьці пачаць, кудысьці рвануць, але зрабіць гэта перашкаджае страх. Вельмі шмат сумневаў лунае вакол вас, не даючы засяродзіцца, вызначыць кола задач і прыступіць да іх рэалізацыі. Прысвяціце першую палову тыдня планаванню і разлікам, каб пазбавіцца ад страхаў і сумненняў. А ў другой палове тыдня знойдзеце падтрымку ў сваім асяроддзі, што дазволіць з поўнай упэўненасцю ўзяцца за рэалізацыю задуманага.



**ДЗЕВА.** Вельмі нестабільны час, можаце кідацца ў розныя крайнасці, што не паляпшае вашай пазіцыі. Эмоцыі могуць падвесці. Паспрабуйце засяродзіцца, бо працуйце не дрэмлюць і вельмі хутка можа стацца так, што вам давядзецца адстойваць сваё месца пад сонцам. Не давярайце іншым людзям, якія б прывабныя прапановы яны ні рабілі. Гэты тыдзень вельмі багаты на рознага кшталту падманы і выпрабаванні вашай прадбачлівасці і асцярожнасці. Галоўная задача — захаваць сваё становішча такім, якое яно ёсць.

## наступны тыдзень



**ШАЛІ.** Вам не варта ўвязвацца ў якія-небудзь справы, паспрабуйце не прымаць ніякіх рашэнняў і нічога не рабіць звыш неабходнага. Ваша задача — назапашванне энергіі і чаканне больш спрыяльнага моманту для дзеянняў. Вывучайце сітуацыю, але не спяшайцеся. Калі прыйдзе час, вы гэта адразу зразумееце і адчуеце. Другая палова тыдня будзе напружанай, спатрэбіцца шмат сіл, каб давесці пачатае да канца, дасягнуць задуманага. Калі пачаць дзейнічаць загадзя, не разабраўшыся, ёсць рызыка зрабіць масу памылак.



**СКАРПІЁН.** Неабходна адмовіцца ад старых задум, бо яны не дазваляюць у належнай меры рэалізаваць сябе. Хутка ўсё праясніцца, цяжкі перыяд застанецца ззаду і адкрыюцца новыя магчымасці. Тыдзень будзе багаты на новыя ідэі і актыўную дзейнасць, што дазволіць рушыць наперад, накіравацца да новых мэтаў і ў хуткім часе дасягнуць іх. Каб не натыкацца на перашкоды, вам неабходна імкнуцца да таго, чаго ў вашым жыцці яшчэ не было і што не будзе чапляцца за вашы старыя няўдачы.



**СТРАЛЕЦ.** Удалы пачатак тыдня, асабліва ў пытаннях, звязаных са зносінамі і адносінамі. На ўсталяванне трывалых сувязяў і кантактаў разлічваць не варта, але для мерапрыемстваў, сяброўскіх зносін і весялосці час самы падыходны. Шмат станоўчай дынамікі, усё адбываецца раптоўна і не па плане, але застое складваецца ўдала, можна нават сказаць, найлепшым чынам. Таму не варта штосьці планаваць, давярэцся плыні часу і атрымлівайце асалоду ад таго, што адбываецца.



**КАЗЯРОГ.** Досыць паспяховы тыдзень, асабліва ў пытаннях фінансавых, але неабходна, каб ва ўсіх справах быў парадак. Нельга спадзявацца на шчаслівы выпадак або ўдалы збег абставінаў — падзеі падлягаюць строгай рэгламентацыі. Тыдзень звязаны са зносінамі, завязваннем кантактаў і заключэннем здзелак. Не выключана ўзнікненне і спрэчных момантаў, што можа нарадзіцца рознагалоссі бліжэй да канца тыдня.



**ВАДАЛЕЙ.** Нягледзячы на тое, што вы будзеце схільныя лунаць у аблоках і аддавацца рознага кшталту фантазіям, рэкамендуецца заняцца надзённымі праблемамі. Назапасілася маса спраў, якія альбо пачаты і не скончаны, альбо і не пачаты зусім, таму неабходна сабрацца з сіламі і давесці іх да розуму. Разлічваць на падтрымку іншых не варта, бо, хутчэй за ўсё, сябры і прыяцелі будуць толькі адцягваць увагу, даючы па гэтым абсалютна не тыя парады. Лепш за ўсё сабрацца і зрабіць усё самому.



**РЫБЫ.** У справах назіраецца застой, але гэта вам толькі на руку. Па-першае, ёсць магчымасць перадыхнуць, набрацца сіл і ўсё добра абдумаць. Менавіта дзякуючы гэтай перадышцы, могуць нарадзіцца новыя ідэі і памкненні. Другая палова тыдня прыўнясе некаторую актыўнасць. Хутчэй за ўсё, у гэты час вы атрымаеце нейкую каштоўную інфармацыю, што дазволіць правільна дзейнічаць у будучыні. А пакуль вольны час варта прысвяціць зносінам з блізкімі людзьмі. Выхадныя для гэтага асабліва спрыяльныя.

# ЧАЦВЕР, 19 ЛЮТАГА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.20** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**9.15, 22.00 Серыял «След».**
**11.00, 13.00, 16.00** 90 секунд.
**11.05, 19.55 Серыял «Выходжу цябе шукаць 2».**
**12.10, 16.40 Серыял «Сямейныя меладрамы-3».**
**13.05** Дзень у вялікім горадзе.
**14.00 Серыял «Адвакатэсы».**
**15.10, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25, 0.50 Серыял «Сваты 6».**
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20, 0.00** Сфера інтарэсаў.
**21.00** Панарама.
**21.40** Спецыяльны рэпартаж.
**0.35** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Тэлераніца.
**9.00, 20.50** Тэлебарометр.
**9.05, 16.50 Баявік «Кулінар-2».**
**10.05** Беларуская кухня.
**10.40 Дэтэктыў «Падмані мяне».**
**11.40 Камедыя «Мадлен».**
**13.20** «Сустрэча з ...» Аляксандр Ткачонак.
**13.55, 18.55 Серыял «Інтэрны».**
**15.25, 20.20 Серыял «Як я сустрэў вашу маму».**
**15.55** Перазагрузка.
**17.55 Серыял «Каханне на раёне».**
**20.55** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/16 фіналу. ПСВ — «Зеніт». У перапынку: **21.45** «Спортлато 6 з 49», **21.50** «КЕНО».
**23.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/16 фіналу. «Севілья» — «Барусія».
**1.00 Фэнтэзі «Усёмагутныя Джонсаны».**

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.15** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 17.35 Серыял «Робін з Шэрвуда».**
**8.50, 12.25, 14.30** «Размаўляем па-беларуску».
**8.55, 10.15, 19.50, 21.30 «Кавой PQ 17». Драма.**
**9.50, 18.25** «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
**12.00, 0.30** «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара, народнага артыста СССР Югена Цікоцкага.
**12.30** «Сустрэчы ў «Букваедзе». Пісьменніца Людміла Уліцкая.
**13.10** Я. Баршчэўскі. «Беларусь у фантастычных апавяданнях». Монаспектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.
**14.05** «Наперад у мінулае».
**14.35 «Бусляня». Кароткаметражны фільм.**
**15.15** «Таямніца душы». Гродзенская семінарыя.
**15.40** «Першапраходцы Далёкага Усходу». «Іван Масквіцін. Шлях да акіяна». Дак. фільм.
**16.35** «Цуды прыроды». Лапландыя. Альпы. Францыя. Гібралтар.
**17.00 «Гваздзік». Драма.**
**18.50** «Размаўляем па-беларуску». Тэлевіктарына.
**19.25** «Сіла веры».
**20.45** Калыханка.
**21.05** «Нябачны фронт». Лендліз. Дак. фільм.
**22.25** «Дыя@блог». «Пра вечнае».
**22.50 «Адмірал Ушакоў». Драма.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**7.00, 3.00** PRO спорт. Навіны.
**7.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд першых матчаў 1/8 фіналу.
**8.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. «Базель» (Швейцарыя) — «Порту» (Партугалія).
**9.55** Біятлон. Маладзёжны чэмпіянат свету ў Раўбічах. Індывідуальная гонка. Юніёркі.
**11.50** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. 1/8 фіналу. Першы матч. «Шальке 04» (Германія) — «Рэал» (Іспанія).
**13.30** Біятлон. Маладзёжны чэмпіянат свету ў Раўбічах. Індывідуальная гонка. Юніёры.
**15.20, 18.00** Тэніс. Турнір ВТА. Дубай. Чвэрцьфіналы.
**17.00** Спорт-кадр.
**17.30** Авертайм.
**21.25** Гандбол. Ліга чэмпіёнаў. «Кіль» (Германія) — «БГК імя Мяшкова» (Беларусь).
**23.00** Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. 1/16 фіналу. Першы матч. «Андэрлехт» — «Дынама» (Масква).
**1.00** Лёгкая атлетыка. Гран-пры. Стакгольм. Прамая трансляцыя.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** «Жыць здорава!».
**10.25** «Кантрольная закупка».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «Фазэнда».
**11.55** «Модны прыгавор».
**13.10** «Мужчынскае/Жаночае».
**14.10** «Сам-насам з усімі».
**15.10, 16.15** «Час пакажа».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20 Серыял «Аднакласнікі».**
**18.50** «Няхай гавораць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Стрэл».**
**23.05 Серыял «Анёл або дэман».**
**23.55** «Вячэрні Ургант».
**0.30** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30 Маст. фільм «Школа зладзеяў. Частка другая».**
**10.10** «Скардзіцца дазваляецца».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.35** «Сямейныя драмы».
**12.30** «Не хлусі мне!».
**13.50, 0.15 Серыял «Фірменная гісторыя».**
**15.40** «Ежа багоў».
**16.50 Серыял «Вовачка».**
**18.40** «Нам і не снілася»: «Усе тайны палацавых пераваротаў».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Меладрама «Прынцэса спецый».**
**22.00** «Глядзець усім!».
**23.00** «Тайны свету».
**23.55** «Аўтапанарама».

### МІР

**6.00** «180 хвілін».
**9.00** «Як справы?».
**9.30, 1.30 Маст. фільм «У Маскве праездам».**
**11.00 Маст. фільм «Скульптар смерці».**
**13.00, 16.00, 19.00, 23.00** Навіны (бягучы радок).
**13.20, 3.55 Серыял «Дарогі Індыі».**
**15.05, 3.00** Дак. серыял «Маленькія тайны вялікіх людзей».
**16.25, 0.35** Ток-шоу «Слова за слова».
**17.20 Серыял «Рускі шакалад».**
**19.25 Маст. фільм «Двайное прозвішча».**
**21.10 Серыял «Марскі патруль».**
**0.25** Навіны (бягучы радок). Галоўная тэма.
**0.35** «Культпрасвет».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.35** «Уся Расія».
**11.50** «Песні пакаленняў. Юрый Антонаў».
**12.50 Серыял «Каменская».**
**13.50, 16.50, 19.50, 22.30** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.30** «Прамы эфір».
**17.10** «Асаблівы выпадак».
**18.00 Серыял «Варажба пры свечках».**
**18.55 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.55, 22.40 Серыял «Ліквідацыя».**
**0.10** «Вечар з Уладзімірам Салаўёвым».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.05** «Справа ўрачоў».
**9.00, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**12.00** «Суд прысяжных».
**13.15** «Суд прысяжных. Канчатковы вердыкт».
**14.15** «Справа густу».
**14.45, 22.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**15.10** «Пракурорская праверка».
**16.20 Серыял «Вуліцы разбітых ліхтароў».**
**18.00** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**20.00 Серыял «Марскія д'яблы. Смерч».**
**21.40, 23.50 Серыял «Пятля».**
**22.55** «Анатомія дня».

### 8 КАНАЛ

**7.00, 13.30, 19.45, 20.55, 23.30** «Надвор'е».
**7.05, 16.00** Мультпарад.
**7.20, 19.50 Серыял «Ключы ад бездані».**
**8.15, 18.30 Серыял «Высакародная жанчына».**
**9.15** «Кінаблакнот».
**9.30 Серыял «Лэдзі-дэтэктыў».**
**10.30, 23.35** «Хобі TV».
**11.00 Драма «Шлях Карліта».**
**13.35 Серыял «Чарцяня».**
**15.15** «Хатняя крама».
**16.30** «МакаShow».
**19.35** «Фэшн is my прафэшн».
**20.45** «Вечарніца».
**21.00** «Даведнік па краінах і кантынентах».
**21.10 Драма «Пабочны эфект».**
**23.05 Серыял «Прыгарад».**

### ВТБ

**6.00, 4.00** «PLAY».
**7.30** М/ф «Смяшарыкі».
**8.00, 17.00, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**8.30** Серыял «Вароніны».
**9.00, 20.00** Сітком «Сямейны бізнес».
**10.00, 19.00** Серыял «Анжаліка».
**11.00, 18.00** Серыял «Кухня».
**12.00** Фэнтэзі «Кроў і шакалад».
**14.00, 23.00, 2.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.30, 17.30** «Лаві момант».
**15.00** Серыял «90210: Новае пакаленне».
**16.00, 3.00** «Маё вяселле лепшае!».
**21.10** Камедыя «Праўда і нічога акрамя...».
**0.00** «Дурні і дарогі».
**1.45** «Кіно ў дэталях».

### КУЛЬТУРА

**6.30** «Еўраньюс».
**10.00, 15.00, 19.00, 23.00** Навіны культуры.
**10.15** «Наглядальнік».
**11.15** Маст. фільм «Маленькія трагедыі».
**12.25** «Сусветныя скарбы культуры».
**12.45** «Расія, любоў мая!». «Абрады бесярман».
**13.10, 20.10** «Правілы жыцця».
**13.35, 0.35** «П'едэстал прыгажосці. Гісторыя абутку з Рэнатай Літвінавай».
**14.05, 1.55** Серыял «Пецярбургскія тайны».
**15.10** «А. Пушкін. «Яўгеній Анегін».
**15.40** «Абсалютны слых».
**16.20** Дак. фільм «Святаслаў Фёдараў. Бачыць святло».
**17.00** «Хлеб і Бяссмерце». Дакументальны праект.
**17.40** Успамінаючы вялікую спявачку. Алена Абразцова і Георгій Свірыдаў.
**18.30** Дак. фільм «Агюст Манферан».
**19.15** Галоўная роля.
**19.30** Чорныя дзіркі. Белыя плямы.
**20.40** «Добрай ночы, малыя!».
**20.50** Дак. фільм «Хрустальныя дажджы. Таццяна Пілецкая».
**21.30** Дак. фільм «Асавец. Крэпасць духу».
**22.10** «Культурная рэвалюцыя».
**23.20** Маст. фільм «Пазнаючы белы свет».
**1.10** Алена Абразцова і Георгій Свірыдаў. Песні і рамансы.
**2.50** Дак. фільм «Іаган Кеплер».

### НАСТАЛЬГІЯ

**6.00** Канцэрт «ВІА «Арызонт». 1982 год.
**6.25, 0.30** Дак. фільм «Лідзія Русланава».
**7.35, 13.45, 1.40** Тэлеспектакль «Марцін Ідэн». 1976 год.
**8.40** Фільм-канцэрт «Песні Аляксандры Пахмутавай». 1977 год.
**9.00, 15.00, 21.00, 3.00** Праграма «Час».
**10.00, 16.00, 22.00, 4.00** «Народжаныя ў СССР».
**11.00, 17.00** «Жадаем Вам...». 1985 год.
**12.00** Дак. фільм «Падарожжа па Маскве». «Па вуліцах старых, запаведных».
**12.25** Фільм-канцэрт «Білі Джоэл у Маскве». 1987 год.
**13.00** «Нам дарогі гэтыя забываць нельга». Вершы Міхаіла Святлова чытае Міхаіл Ножкін. 1985 год.
**13.25, 20.35, 2.40** Канцэрт замежнай эстрады.
**18.00** «Клуб кінападарожнікаў». «Невядомы Кусто». 1985 год.
**19.05** Дак. фільм «Зімні Талін».
**19.20** Фільм-спектакль «Анаміка». 1987 год.
**23.00** Праграма «ТЭМА» з У. Лісіцьевым: «Гумар». 1992 год.
**0.00** «Марафон-15 — малым». 1993 год.
**5.00** «Песня-74».

### EUROSPORT

**10.30, 15.00, 1.00** Лыжныя гонкі. Чэмпіянат свету.
**11.30, 14.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету. Турнэ 4-х трамплінаў.
**12.30, 20.00, 2.30** Веласпорт.
**18.45, 2.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Чэмпіянат свету.
**20.45** Снукер. Welsh Open.

### КАМЕДЫЯ

**6.00, 10.00, 17.30, 22.00, 3.10** Серыял «Пакетная здзелка».
**6.45** Камедыя «Закаханы скнара».
**8.25** Камедыя «Закаханы і бязбройны».
**10.45** Камедыя «Спатканне ўсляпую».
**12.20, 14.25, 15.15, 20.00, 22.45, 0.55, 5.35** Скетчком «Паміж намі».
**12.35** Дэтэктыў «Высокі бландзін у чорным чаравіку».



**14.00, 14.50, 15.30** «Камедыянты (Шоу)».
**16.00** Камедыя «Карсіканец».
**18.20** Камедыя «А калі гэта каханне?».
**20.20** Камедыя «Осцін Паўэрс: чалавек-загадка міжнароднага маштабу».
**23.10** Камедыя «Госць у доме».
**1.15** Камедыя «Учора, сёння, заўтра».
**4.00** Прыгоды «Дарога ў Занзібар».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**7.25** «Доктар І...».
**7.55, 18.45, 1.40** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**9.40, 3.40** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**11.25, 17.55** Дак. серыял «Справа Астахава».
**12.20, 17.00** Дак. серыял «Сакрэты экстрасэнсаў».
**13.15, 20.45** Серыял «Пошукі доказаў».
**14.10** «Простыя складанасці».
**14.40, 0.10** Серыял «Каменская».
**15.30, 22.30** «Зорныя гісторыі».
**16.30, 3.15** «Нераскрытыя тайны».
**21.40, 0.55** Серыял «Катоўскі». Заключная серыя.
**23.25** Серыял «Сакрэтныя матэрыялы».
**5.15** Серыял «Аўрора».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.35, 1.50** Драма «Касмаполіс».
**8.20, 13.55** Драма «Некалькі добрых хлопцаў».
**10.35** Камедыя «Хлопчыкам гэта падабаецца».
**12.10** Драма «Скарб».
**16.10** Драма «Буш».
**18.15** Трылер «Ілюзія падману».
**20.10** Драма «Танцуй са мной».
**22.20** Драма «Разня».
**23.50** Баявік «Кілеры».
**3.45** Фантастыка «Паралельныя светы».

### ТБ1000

**6.20** Камедыя «На здрадзе».
**7.50** Камедыя «Адно каханне на мільён».
**9.40** Фэнтэзі «Казка. Ёсць».
**11.10** Камедыя «Калачы».
**12.40** Фільм-казка «Каралеўна».
**14.00** Камедыя «Хлопец з Марса».
**15.50** Камедыя «Кітайская бабуля».
**17.30** Камедыя «Са мною вось што адбываецца».
**18.50** Драма «Забава».
**20.20** Камедыя «Падарунак з характарам».
**21.50** Баявік «22 хвіліны».
**23.10** Камедыя «Горка!».
**00.50** Меладрама «Жаніх па аб'яве».
**2.30** Трагікамедыя «Белы маўр, або Інтымныя гісторыі пра маіх суседзяў».
**4.10** Драма «Збаvenне».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**6.00** Мегазаводы.
**6.45, 12.40, 18.45, 22.55, 2.40, 5.40** Зрабі або памры.
**7.30, 8.55, 10.25, 13.25, 14.55, 19.10, 20.15, 22.30, 2.15, 5.15** Навуковыя недарэчнасці.
**7.55** Гульні розуму.
**8.15** Папулярная навука.
**9.40, 11.10, 14.10, 19.30** Машыны: разабраць і прадаць.
**10.25, 14.55, 20.15** Шаша праз пекла.
**11.55** Золата Юкана.
**13.50** Кіраванне натоўпам.
**15.45** Ласасёвыя войны.
**16.30** Дзікія жывёлы Поўначы.
**17.15** Прадвеснікі Апакаліпсісу.
**18.00** Дзень «Д».
**21.00, 0.45, 3.45** Экстрэмальнае падарожжа.
**21.45, 1.30, 4.30** Экстрэмальныя даследчыкі.
**23.15** Мяжа.
**0.00** Эвакуацыя Зямлі.
**3.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.

### DISCOVERY

**8.00, 10.55, 15.55, 21.20** Як гэта зроблена?
**8.25, 10.30, 15.30, 21.45** Як гэта ўстроена?
**8.50, 11.20** Не спрабуйце паўтарыць.
**9.40, 13.50** Пятая перадача.
**12.10, 18.00** Багажныя войны.
**13.00, 7.05** Рачныя монстры.
**14.40, 6.05** Навука магіі.
**16.20, 4.25** Што ў вас у гаражы?
**17.10, 5.15** Махінатары.
**18.50** Склады.
**19.40** Бітва за нерухомасць.
**20.30** Бітвы за кантэйнеры.
**22.10** Залатая ліхаманка.
**23.50** Брыстальскі заліў.
**0.40, 3.35** Гульні ў ламбардзе.
**1.30** Top Gear.
**2.20** Маланкавыя катастрофы.
**2.45** Сапраўдныя аферысты.

# ЧАРОЎНЫЯ ФАРБЫ КІТАЙСКАЙ ВЯСНЫ

**У Мінскім палацы дзяцей і моладзі адзначылі «Вясёлае Свята вясны», галоўнае традыцыйнае свята кітайскага народа. Яно арганізавана ў нашай сталіцы з мэтай умацавання кітайска-беларускага культурнага супрацоўніцтва пры падтрымцы міністэрстваў культуры абедзвюх краін, Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь сумесна з кампаніяй Huawei ў Беларусі, Інстытутам Канфуцыя ў БДУ і Мінгарвыканкамам.**
**Мінчан і гасцей сталіцы, якія сабраліся ў палацы, вітаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітая ў Беларусі Цуй Цымін.**

Жыццядайная чырвань узыходзячага сонца і золата яго прамянёў — такі галоўны колер сцэнічных касцюмаў, у якіх маладыя артысты Нанкінскага тэатра песні і танца пачалі святочнае выступленне. Госці з Кітая адразу зачаравалі энергіяй музыкі і рухаў. Харэаграфічныя нумары пераносілі гледачоў то ў далёкае мінулае, напоўненае таямнічымі ўсходнімі метафарамі, то ў наш час, дзе людзей розных кантынентаў яднаюць сучасныя рытмы і мелодыі.

Але не толькі ўзоры танцаў, музыкі, цыркавых нумароў паказалі нашы кітайскія сябры. Гэта вялікае святочнае мерапрыемства ў Мінскім палацы дзяцей і моладзі было анансавана як культурны кірмаш для дзяцей і бацькоў, дзе даецца магчымасць адчуць духоўнае багацце галоўнага традыцыйнага кітайскага свята. Цікавасць да багатай культурнай спадчыны нашых усходніх сяброў сабрала ў палацы мінчан усіх пакаленняў.

Наведвальнікі атрымалі тут унікальную магчымасць пазнаёміцца з сакрэтамі напісання іерогліфаў і паспрабаваць сябе ў кітайскай каліграфіі. Дзяцей асабліва прываблівалі майстар-класы малявання пейзажаў, паказ стварэння простых цацак з паперы, знаёмства з прыёмамі рукадзелля. Вакол століка, дзе адбывалася «чайная цырымонія», збіраліся аматары гэтага напою і ахвотныя пачуць расповед пра тонкія рытуалы традыцыйнай усходняй культуры чаяпіцця. Даспадобы малым прыйшліся і прысмакі, якімі частуюцца іх кітайскія аднагодкі.


На ўспамін пра Беларусь госці з Кітая павязуць цікавыя фотаздымкі.


Майстар-клас дае знаўца кітайскай каліграфіі.

**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
**Фота аўтара.**


Тут маленькіх наведвальнікаў чакалі кітайскія цацкі.

## Побач з намі

# ЦЯПЕР БУДЗЕ ЗРУЧНЕЙ

## Таксі не звычайнае — сацыяльнае. Першая «ластаўка» ў Гродне ўжо ёсць

**Побач з намі жывуць людзі, якія не могуць скарыстацца паслугамі звычайнага таксі. Гэта, у прыватнасці, інваліды-калясачнікі, для перавозкі якіх патрэбны транспарт са спецыяльным пад'ёмным прыстасаваннем, дзеці-інваліды, а таксама людзі, якія рухаюцца з дапамогай палкі ці мыліц. Такую машыну нядаўна набыў за свае сродкі Гродзенскі аўтобусны парк.**

**Дырэктар аўтобуснага парка Мікалай ДРАВІЛА** расказаў, што мікрааўтобус, які будзе выкарыстоўвацца як «сацыяльнае таксі», прыстасаваны для перавозкі аднаго інваліда-калясачніка і яшчэ сямі чалавек. Пажадана, вядома, загрузіць яго па максімуме. Таму мяркуецца, што ў цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва будзе фарміравацца заяўка на заўтрашні дзень, якая затым паступіць да аператара парка.

Зразумела, што такая сацыяльная паслуга не прадугледжвае нейкіх фінансавых «дывідэндаў» для перавозчыка. Але разам з тым яна не павінна быць для яго і стратнай. Для гэтага пэўная частка затрат павінна аплачвацца пасажырамі «сацыяльнага таксі» альбо іх сваякамі. Адпаведныя льготныя ўмовы аплаты за паездкі ўжо распрацаваны.

Такім чынам, першая «ластаўка» ў сферы «сацыяльнага таксі» ў Гродне ўжо ёсць і неўзабаве распачне работу. Аднак аднаго мікрааўтобуса яўна недастаткова, бо толькі інвалідаў-калясачнікаў у абласным цэнтры каля 400 чалавек. І яны, як правіла, пры наведванні той жа паліклінікі цалкам залежаць ад транспарту сваякоў ці сяброў.

Нядаўна ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Гродзенскага гарвыканкама ініцыявала дабрачынную акцыю па зборы сродкаў на пакупку спецыяльнага аўтамабіля для службы «сацыяльнае таксі». Садзейнічаць гэтаму могуць прадпрыемствы і арганізацыі, усе гродзенцы, пералічыўшы любую суму на **пазабюджэтны дабрачынны рахунак ДУ «Цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Гродна»: разліковы рахунак 3642000000221, філіял 400 АСБ «Беларусбанк», УНН 590661901, КОД 752.**

Паводле інфармацыі **дырэктара Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна г. Гродна Ірыны СКРАБЦОВАЙ,** частка патрэбнай сумы (па цяперашніх цэнах ён можа каштаваць каля 400 мільёнаў рублёў) на дабрачынны рахунак ужо пералічана і, акрамя таго, ёсць адпаведныя дамоўленасці з шэрагам арганізацый. Ірына Анатольеўна ўпэўнена, што сёлета атрымаецца сабраць неабходную суму, пасля чаго будзе аб'яўлены тэндар на набыццё аўтамабіля.

Дарэчы, мікрааўтобус са спецыяльным пад'ёмным прыстасаваннем ужо два гады выкарыстоўваецца ў якасці сацыяльнага таксі ў Лідзе. Гэтая паслуга (для наведвання розных сацыяльных устаноў) вельмі запатрабаваная, паведаміла **дырэктар Лідскага раённага тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Таццяна ПЕТУХ.**

**Барыс ПРАКОПЧЫК**


## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА, находящегося в хозяйственном ведении УП «Медтехника» г. Гродно

| | Лот № 1 | Лот № 2 | Местонахождение имущества: **г. Гродно, пр. Космонавтов, 60/2** |
|---|---|---|---|
| **Предмет торгов, краткая характеристика** | **Автомобиль ГАЗ 3307,** инв. № 462, год выпуска – не определен, двигатель бензиновый, тип кузова – грузовой фургон | **Автомобиль GAZ-3307,** инв. № 488, 2003 г.в., двигатель бензиновый, тип кузова – грузовой фургон изотермический | |
| **Начальная цена** | 21 272 021 рубль с учетом НДС | 33 657 600 рублей с учетом НДС | Срок заключения договора купли-продажи: **в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о проведении торгов** |
| **Сумма задатка** | 2 127 200 рублей | 3 365 700 рублей | |
| **Сведения о продавце** | УП «Медтехника» г. Гродно, ул. Доватора, 7, тел. 8(0152) 48 26 94 | | Условия оплаты: **по договоренности сторон** |
| **Сведения об организаторе торгов** | Гродненское областное учреждение финансовой поддержки предпринимателей, г. Гродно, ул. Мицкевича, 8, тел.: 8(0152) 77 23 79, 74 49 11 | | |
| **Номер счета организатора торгов для перечисления задатка** | р/с 3015575033025 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, код 739, УНП 500481906 | | Тел. для справок в г. Гродно: **8(0152) 74 49 11** |
| **Торги состоятся 16 марта 2015 года в 12.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8** | | | |
| **Срок подачи документов для участия в торгах** | по 10 марта 2015 года включительно до 16.00 часов по адресу: г. Гродно, ул. Мицкевича, 8 | | |

**Условия участия и порядок проведения аукциона размещены на сайте организатора торгов www.fincentr.by**



**Филиал «Центр «Белтехинвентаризация»**
**г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2**

- ✓ Оценка оборудования и транспортных средств
- ✓ Оценка недвижимости и сетей всех форм собственности
- ✓ Независимая строительная экспертиза

## Извещает о проведении аукциона по продаже имущества ОАО «Гомельский радиозавод», 8(0232)21 60 07

| № лота | Наименование объекта | Начальная цена продажи лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | - Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-157408, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9/22, площадь – 6186,1 кв.м, назначение – Здание специализированное растениеводства, наименование – Здание специализированное растениеводства (составные части и принадлежности: пристройка Б1/к, пристройка В1/к) по начальной цене – 3 779 640 000 рублей с НДС.<br>- Капитальное строение с инвентарным номером 350/С-160196, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Объездная, 9/25, площадь – 10,3 кв.м, назначение – Здание административно-хозяйственное, наименование – Здание административно-хозяйственное (составные части и принадлежности: покрытие площ. 575 м, забор площ. 3840 м, ворота (3 шт.), железная дорога, бортовые камни) по начальной цене – 1 300 440 000 рублей с НДС.<br>Кадастровый номер и площадь земельного участка на котором расположены объекты оценки 340100000005005687 / 30,9449 га. | 5 080 080 000 | 508 008 000 |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 16 марта 2015 г**. в рабочие дни с $9^{00}$ до $17^{00}$ от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2 |
| **Дата, время, место проведения аукциона** | **18 марта 2015 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2, |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | р/с 3012105618108 в РД №700 ОАО «БПС- Сбербанк», код 369, УНП 102353509<br>Получатель платежа: Филиал «Центр «Белтехинвентаризация» РУП «Жилкоммунтехника» |
| **Условие пользования** | Объекты продаются в собственность |
| **Условия продажи** | Шаг аукционных торгов – 5%, заключить договор купли-продажи в течение 20-ти календарных дней после подписания протокола о результатах аукциона, оплатить стоимость объекта согласно договора купли-продажи. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона. |

**Дополнительная информация по тел. (0232) 75 06 62, 75 06 63 (факс) и на сайте www.bti.by**



## ОАО «СПЕЦМОНТАЖСТРОЙ»

**извещает своих акционеров (их представителей) о проведении 18 марта 2015 г. очередного общего собрания по адресу: г. Минск, ул. Володько, 20.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об итогах работы Общества в 2014 году и основных направлениях развития на 2015 год.
2. Отчет наблюдательного совета и ревизионной комиссии о работе в 2014 году.
3. Утверждение годового бухгалтерского баланса Общества и направлений использования чистой прибыли за 2014 год. О дивидендах за 2014 год.
4. О направлениях использования прибыли Общества в 2015 году.
5. Утверждение условий материального вознаграждения членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
6. Выборы членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Об уменьшении уставного фонда Общества путем аннулирования приобретенных Обществом акций собственного выпуска и сокращения их общего количества.
8. О внесении изменений и дополнений в устав ОАО «Спецмонтажстрой» и утверждении его новой редакции .

Начало работы собрания **в 12.00.**
Регистрация участников собрания **с 11.30 до 11.50** в день проведения собрания.
При себе иметь документ, удостоверяющий личность. УНП 100036332



Деятельность Индивидуального предпринимателя ГОЛОВИЧЕВА Юрия Алексеевича (УНП 190259334) **ликвидируется.** Претензии принимаются по тел. 8-029-638-55-47 в течение 2 двух месяцев.



Утерянные страховые полисы СООО «Белкоопстрах» по добровольному страхованию от несчастных случаев на время поездки за границу формы 2РН, 2РП серии БМ № 0727882, 0729304, 0747982, 0747983, 0718981, 0718982, страховое свидетельство по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВР № 5077887, **считать недействительными.** УНП 100706519



Страховой полис по добровольному страхованию от болезней и несчастных случаев на время поездки за границу (Балтассистанс) формы 2РН серии БА № 0732312 страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительным в связи с утерей**.

■ Адкрытае пытанне

# ЯК РАЗБУРЫЦЬ СЦЯНУ ПАМІЖ ЖЫЛЬЦАМІ І ЖЫЛЛЁВЫМІ СЛУЖБАМІ

**Чатыры месяцы мінчанка Алена Шуцько і яе маці Яніна Антонаўна Клімовіч змагаліся за знос, на іх думку, самавольна ўстаноўленай сцяны ў тамбуры агульнага калідора. Яна, тая сценка, адгарадзіла маленечкі калідор і памяшканне, якое жанчыны называюць калясачнай. Паводле іх слоў, каб занесці ці вынесці мэблю, трэба прасіць адчыніць дзверы той самай калясачнай, якую даўно ўжо пераўтварылі ў кватэру для работнікаў ЖЭСа. Зрэшты, супярэчлівыя тлумачэнні наконт яе законнасці даюць і самі жыллёвыя службы.**

## «СЦЯНА З'ЯВІЛАСЯ... НОЧЧУ»

Кватэру ў новапабудаваным доме па вуліцы Гараўца ў Мінску Яніне Антонаўне Клімовіч выдзелілі ў 1980 годзе. Дагэтуль жанчына ў падрабязнасцях памятае, як атрымала ключы, як першы раз адчыняла дзверы свайго будучага жытла. Усё тады ёй спадабалася: прыгожа, утульна, калідор прасторны... Аднак на наступны дзень яна яго не пазнала: літаральна за ноч побач з яе кватэрай «вырасла» сценка... Нездабае за ёю пасялілі людзей.

Яніна Антонаўна, вядома ж, разбірацца ні з чым не стала. Падумала: ну што яна, простая работніца фабрыкі, зразумее ў гэтых справах? Калі зроблена, значыць, так трэба. Не будзеш жа турбаваць суседзяў. Тым больш, што жывуць яны ціха, нікому не перашкаджаюць...

Пашчасціла Яніне Антонаўне не толькі з гэтымі суседзямі, але і з наступнымі, калі ў кватэры за сценкай пасяліўся электрык ЖЭСа. З яго сям'ёй яны нават пасябравалі. Але ўсё цячэ, як той казаў, усё мяняецца. Летась «кватэру» сталі рыхтаваць для новай гаспадыні — таксама работніцы ЖЭСа, і тут ужо Яніна Антонаўна забіла трывогу.

Паспрыяў гэтаму выпадак. У кватэры жанчыны перагарэла праводка. Дзякуй Богу, нічога страшнага не здарылася, спецыялісты ўсё прывялі ў парадак. Але ж спужалася гаспадыня не на жарт, бо канчаткова зразумела, што крый Бог пажар — з кватэры не вынесеш амаль нічога, а тым больш з мэблі, бо на маленькім пятачку агульнага калідора плошчай у два квадратныя метры з буйнагабарытнай ношай проста не развярнуцца. Для таго, каб гэта зрабіць, неабходна адчыняць дзверы суседзяў.

Вось тады пенсіянерка і напісала першы ліст у ЖРЭА Ленінскага раёна аб тым, што 35 гадоў таму ля яе кватэры, відаць, незаконна паставілі сценку. Да справы падключылася і дачка Яніны Антонаўны — Алена Шуцько.

На яе ліст, дасланы ў ЖРЭА, прыйшоў досыць аптымістычны адказ пра тое, што (даслоўна) «**работы па зносе самавольна ўсталяванай перагародкі ў тамбуры агульнага міжкватэрнага калідора будуць выкананыя ў снежні бягучага года (2014. — Аўт.), студзені 2015 года».**

Здавалася б, добра, трэба толькі пачакаць. І жанчыны гэта спакойна рабілі б, калі б не бачылі, што побач адбываецца нешта зусім не падобнае на абяцаны знос і дэмантаж: на дзвярах калясачнай, у прыватнасці, з'явіўся яшчэ адзін замок, у самім памяшканні працягваліся рамонтныя работы. А начальнік ЖЭУ-51, на прыём да якога схадзіла Алена Шуцько, паказаў ёй замоўленую ў інстытуце «Белпраект» копію плана першага паверха дома. На ім, па словах жанчыны, мяккім алоўкам і няроўна была намалявана... тая самая перагародка.

Зразумеўшы, што знос яе паранейшаму пад пытаннем, Алена Іосіфаўна напісала ў ЖРЭА яшчэ адзін ліст. І ў хуткім часе атрымала яшчэ адзін адказ, дзе чорным па белым было напісана, што (зноў жа даслоўна) «**работы па зносе самавольна ўсталяванай перагародкі ў тамбуры міжкватэрнага калідора пачатыя», і што «пасля вышэйзгаданага зносу будзе выкананы касметычны рамонт тамбура».**

Пасля гэтага (перагародка ж як стаяла, так і стаіць!) жанчынам нічога не заставалася, як звярнуцца ў адміністрацыю Ленінскага раёна сталіцы. На гэты раз у адказе мала таго, што пераблыталі імя па бацьку заяўніцы і нумар пад'езда, дзе жыве яе маці, — пераблыталі, відаць, яшчэ і сценкі, бо паведамілі, што тая перагародка... адпавядае праектнаму рашэнню дома.

— Як можна пісаць, не бачачы, пра што ідзе гаворка? Хоць бы хтонебудзь з гэтых начальнікаў прыйшоў ды паглядзеў, што тут насамрэч, — абураецца Алена Іосіфаўна.

## СПРАВА ПРЫНЦЫПУ

Калі карэспандэнта «Звязды» жанчыны правялі ў кватэру-калясачную, перад вачыма паўстала карціна разгорнутых рамонтных работ. Спецыяліст, які іх выконваў, прадстаўляцца адмовіўся, але паведаміў, што ніякая гэта не калясачная, а жылая кватэра. Сапраўды, выглядае памяшканне менавіта так: ёсць кухня, санвузел, адзін пакой і калідорчык, што звязвае іх паміж сабой.

Між тым злашчасная сценка, якая адгароджвае гэтае жытло ад агульнага тамбура, на апорную, прадугледжаную праектам, яўна не цягне...

— Вы ўлічвайце, што яна будзе знасіцца, — сказаў рамонтнік, мякка кажучы, выстаўляючы нас за дзверы.

А напярэдадні, як распавялі жанчыны, прыходзіў спецыяліст з аддзела МНС і пацвердзіў, што шырыня агульнага калідора каля іх кватэры меншая за норму. У прыватнай размове, апроч прапанаваных варыянтаў (перанесці сценку на 50 сантыметраў у бок так званай калясачнай або паставіць яе наўскос), ён паведаміў, што гэту перагародку можна было б наогул знесці...

Аднак камунальнікі абралі найпрасцейшы з варыянтаў. У выніку за той спрэчнай перагародкай усё ж з'явілася новая, з газасілікатных блокаў, праўда, на адлегласці не 50 сантыметраў, а 25.

Жанчыны пагаджаюцца: столькі гадоў жылі з гэтай сценкай і будуць жыць далей, калі яе не знясуць. Але тут ужо іх хвалюе іншае пытанне: чаму давялося сутыкнуцца з такой неразборлівасцю і такім высокім узроўні?

— Мне 76 гадоў, я ўжо задумалася, як труну выносіць з кватэры, бо яна ж не пройдзе, — прызнаецца Яніна Антонаўна. — Столькі працавала, столькі чакала, каб уехаць у гэтую кватэру. І дачакалася...

— Мы гатовыя да дыялогу і будзем рады, калі побач пасяляцца добрыя людзі, але хочацца, каб усё было талкова зроблена, — гаворыць дачка.

◆ ◆ ◆

Калі гэты матэрыял ужо быў падрыхтаваны да публікацыі, Алена Шуцько паведаміла, што сценку, якая не давала спакою сям'і, усё ж такі знеслі. Аднак пытанні да мясцовых начальнікаў у заяўніцы засталіся. І галоўнае з іх — чаму такія супярэчлівыя адказы прыходзілі ад камунальнікаў?

**Дзіяна СЕРАДЗЮК**

■

■ Свой погляд

# ЦІ ВАРТА ПЛОТ ГАРАДЗІЦЬ?

**Англійскія вучоныя прыйшлі да высновы, што цэлы шэраг псіхічных захворванняў узнікае з прычыны адарванасці людзей ад прыроды, ад іншых людзей і соцыуму. У прыватнасці, тыя, хто доўгі час знаходзіўся ў месцах зняволення, куды больш схільныя да перажыванняў страху, падазронасці, нервовасці і да стрэсаў.**

Зрэшты, каб адарвацца ад людзей і прыроднага асяроддзя, зусім не абавязкова быць асуджаным. Многія сучаснікі самі, добраахвотна, адгароджваюць сябе ад людзей, раслін і жывёл, трымаюць сваё цела і дух у дамах за высокімі платамі і гэтым адкрыта дэманструюць непавагу да ўсяго і ўсіх, што знаходзіцца па-за агароджамі іх прыватнага свету.

Высокія агароджы апошнім часам сталі прыкметай забяспечанасці, улады... Хоць, на мой погляд, яны не дадаюць іх гаспадарам ні рэальнага аўтарытэту, ні інтэлігентнасці, ні чалавекалюбства. У якасці прыкладу можна прывесці катэджны комплекс у раёне гарадскога пасёлка Ждановічы. Аж да 90-х гадоў мінулага стагоддзя ён уяўляў сабой утульную, кампактную вёску. Цяпер жа ўсё відавочна змянілася: дамы-асабнякі хаваюцца за 2-, 3-метровымі агароджамі з відэаназіраннем ды сігналізацыяй...

Штучнае размежаванне чалавечай супольнасці суправаджаецца самымі сур'ёзнымі наступствамі як для людзей, так і для прыроднага, сацыяльнага асяроддзя. Яно можа садзейнічаць, а бывае, і перашкаджаць працэсу станаўлення асобы. Усё залежыць ад таго, наколькі правільна мы ставімся да прыроднага і чалавечага асяроддзя. Псіхолагі лічаць, што любыя дзеянні чалавека ў выніку ізаляцыі ад іншых амаль на 100 % прыводзяць да парушэння гармоніі з прыродай, што непазбежна ўплывае на псіхіку і агульнае здароўе. Дык ці трэба яго разбураць?

**Сяргей АНУПРЫЕНКА,**
*г. Мінск*

■



■ Была вайна

# ПАЯДЫНАК СА ЗВЕРАМ

**Сабака здаўна і справядліва лічыцца сябрам чалавека. Ён і абаронца, і ахоўнік, і пастух, і выратавальнік. Многім з іх і ў многіх краінах пастаўлены помнікі. Але ж быў у нашай гісторыі час, калі сабака станавіўся вельмі небяспечным.**

Пасля ўдала праведзенай аперацыі «Баграціён» немцы сталі спешна адыходзіць на захад, кідалі тэхніку, узбраенне і абучаных нямецкіх аўчарак. Тыя, застаўшыся сам-насам, харчаваліся тым, што маглі знайсці, часам нападалі на людзей. Шмат падобных выпадкаў было ў заходняй частцы Плешчаніцкага (цяпер Лагойскага) раёна, каля вёсак Задор'е, Горна, Ізбішча, Папоўцы, Мацеева. Менавіта праз гэта ў пасляваенныя гады дзеці хадзілі ў школу грамадой. Ды і дарослыя асцерагаліся: калі нехта выбіраўся ў дарогу адзін, то браў з сабой палку з наматанымі на яе анучамі і саломай, каб у выпадку небяспекі запаліць факел і такім чынам адагнаць звера.

Нашу вёску Папоўцы, — узгадвала мая знаёмая Марыя Буйніцкая, — немцы спалілі. А ў суседняй Мільчы жыла наша цётка. Мы з братам часта бывалі ў яе. У той дзень — удваіх пасвілі карову. Брат (ён старэйшы, мне пяты гадок ішоў, яму дзясяты) і кажа: «Бяжы, адгані вунь тую карову, у жыта пайшла». Я пабегла... А тут — наперарэз — сабака: цераз мяне перасочкнуў і стаў. Я ў крык. А ён язык высунуў, зубамі ляскае, але ж пакуль не чапае: ён на мяне глядзіць, я — на яго. На ім, бачу, ашыйнік дужа прыгожы — ланцужком... І бліскучы такі, жаўтаваты, плецены...

А брат, відаць, пачуў, што я крыкнула, падбег і закрыў мяне сабой. Іншы б, можа, уцёк, бо таксама дзіцё, а ён, бач, не. Выхапіў з рук у мяне пугу і давай ёю размахваць, сабаку біць... Ну і крычалі мы абое так, што людзі на хутарах пачулі. Хто вілы схапіў, хто касу ці сякеру і хутчэй да нас. Сабака, мусіць, спалохаўся гэтага натоўпу, павярнуўся і пайшоў у жыта. Адтуль, як зараз памятаю, выглядваў яшчэ адзін. Гэта былі нямецкія аўчаркі.

Брат пасля гэтага паядынку доўга хварэў, нічога есці не мог. Бабка адна яго святой вадой аблівала, малітвы чытала, сказала маме, якімі травамі лячыць. Так і акрыяў...

Сёння гэта здарэнне, гэты паядынак са зверам, успамінаецца жанчыне як незвычайная прыгода, а тады ўсё магло скончыцца вельмі трагічна.

**Аляксандр ПАЎЛЮКОВІЧ,**
*г. Мінск*

■

■ Рэзананс

# НІХТО НЕ КРЫЎДЗІЦЬ ХІМІКА

**У нумары за 30.12.2014 г. пад рубрыкай «Зачапіла» быў змешчаны ліст спадарыні Ніны Голубевай з Мінска «Навошта крыўдзіць хіміка?». У ім чытачка пыталася, чаму ў аўтобусе 59 маршруту ў абвестцы прыпынку гучыць «Вуліца Мін-дзялеева»? Пасля публікацыі гэтага ліста, у рэдакцыю прыйшоў яшчэ адзін…**

У тым, што «Звязда» надрукавала, а не «замяла» гэтае, толькі на першы погляд дробнае пытанне, мне бачыцца станоўчы бок, бо за 20 гадоў двухмоўя многія ўжо развучыліся не толькі разумець мову карэннага насельніцтва, але і чуць яе. І ці трэба гэтаму здзіўляцца, калі нават на радыё лічаная супрацоўнікі робяць правільны асноўны націск у слове «шэ́сцьдзясят» — на першым складзе. Кожныя ж пяць хвілін (так атрымалася — гэтая лічба трапіла ў нумар тэлефона для рэкламных абвестак) слухачам літаральна ўбіваюць у галовы «шэсцьдзяся́т», з асноўным націскам на апошнім складзе, як у рускай… Калі так пойдзе далей, націскным могуць зрабіць і другі склад (а не трэці, як трэба, калі гаворыш пабеларуску) у лічэбніках адзінаццаць, чатырнаццаць…

І гэта, паўтаруся, на радыё. Што ўжо казаць пра цягнікі эканом-класа, дзе, ламаючы язык, гучыць фраза пра дзейнасць на чыгунцы правіл *«адпаведна з (паўза) заканадаўствам»*. У той час як павінна гучаць: *«…у адпаведнасціззаканадаўствам»* — злітна, без паўзы.

Беларускае слова «толькі» там жа прамаўляецца на рускі манер — *«только»*. Назва прыпынку Раўнаполле — як *«Раўнаполье»*, а «Весялоўскі» і наогул гучыць праз доўгае *у*. Паспрабуйце вымавіць. Гэта хіба не "чапляе"?

Што датычыцца прозвішча Мендзялееў, то па-беларуску *е* ў ненаціскным складзе і павінна вымаўляцца бліжэй да «і». Выдатны дыктар Беларускага радыё Эдуард Данчанка (светлай памяці, бо менавіта яго голасам аб'яўляюцца прыпынкі ў сталічным транспарце), як мне здаецца, памыляцца не мог.

**Канстанцін САФРОНЕНКА, былы рэжысёр Беларускага радыё і тэлебачання.**
*г. Мінск*

■

**Ад рэдакцыі:**

**Колькі знаўцаў (а часам і слоўнікаў), столькі меркаванняў. У вас ёсць сваё? Пішыце. Абмяркуем.**

ДЛЯ ЗВАРОТАЎ

ZVAROT@ZVYAZDA.MINSK.BY

## Открытое акционерное общество «Актамир» сообщает о проведении 11 марта 2015 г. очередного годового общего собрания акционеров

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

**1.** Об итогах деятельности ОАО «Актамир» за 2014 год.
**2.** Отчет ревизионной комиссии.
**3.** Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества по итогам работы за 2014 год. О составлении и предоставлении бухгалтерской отчетности в 2015 году.
**4.** Об утверждении направлений распределения прибыли за 2014 год. Определение направлений использования чистой прибыли на 2015 год и 1 квартал 2016 года.
**5.** Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии ОАО «Актамир».

Место проведения собрания: **г. Москва, ул. Маросейка, 3/13.**

Начало собрания **в 10.00** (время московское).

Список акционеров, имеющих право на участие в собрании, будет составлен по данным реестра акционеров **на 1 марта 2015 года.**

Регистрация участников будет проводиться **с 9.45** по месту проведения собрания.

Лица, имеющие право на участие в собрании, могут ознакомиться с информацией (документами) к собранию: **с 3 марта 2015 года** в рабочие дни с 16.00 до 17.00 по месту нахождения ОАО «Актамир»: г. Минск, пер. Бехтерева, 10, комн.1207, а в день проведения собрания – по месту его проведения.

Для регистрации на собрании при себе иметь:

акционеру общества – паспорт или другой документ, удостоверяющий личность, а представителю акционера – дополнительно доверенность.

УНП 100097980 *Наблюдательный совет ОАО «Актамир»*

---

**ОАО «Світанак» г. Жодино**

## ПРИГЛАШАЕТ ОРГАНИЗАЦИИ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ

**на выполнение работ по техническому обслуживанию охранной, пожарной сигнализации и системы видеонаблюдения на объектах ОАО «Світанак» г. Жодино.**

Заявки принимаются по адресу: **г. Жодино, ул. 8 Марта, 1 до 11.00 23.02.2015 г.**

За дополнительной информацией обращаться **по тел. 8(01775) 7-14-92, 7-97-74.**

УНН 600038919

---

**ОАО «Світанак» г. Жодино**

## ПРИГЛАШАЕТ ОРГАНИЗАЦИИ ПРИНЯТЬ УЧАСТИЕ В ПЕРЕГОВОРАХ

**на выполнение профилактических наладочных работ по газовому оборудованию сушильных машин (КИПиА систем топливоподачи, горелочных устройств) и технической диагностики сушильно-ширильных машин, сушильного участка красильно-отделочного цеха ОАО «Світанак» г. Жодино.**

Заявки принимаются по адресу: **г. Жодино, ул. 8 Марта, 1 до 10.00 23.02.2015 г.**

За дополнительной информацией обращаться **по тел.: 8(01775) 7-14-92, 7-97-74.**

УНН 600038919

---

УНП 805001668

## ОТЧЕТ Международного социально-экономического фонда «Идея» об использовании имущества за 2014 год

Международный социально-экономический фонд «Идея» зарегистрирован Министерством юстиции Республики Беларусь решением №112 от 26.05.2011 и внесен в ЕГР за №805001668.

Адрес фонда: 220004, г. Минск, ул. Замковая, д. 27, каб. 16, пом. 7

1. Учредители фонда – Радьков В.М. и Самусев П.Н.

2. Информация о стоимости имущества фонда:

- имущество, денежные средства, переданные учредителями (учредителем) фонда, физическими лицами, – 144 088 700 белорусских рублей;
- доходы, полученные от осуществляемой в соответствии с уставом фонда предпринимательской деятельности, – 1 205 469 313 белорусских рублей;
- прочие доходы фонда, не запрещенные законодательством Республики Беларусь, – 1 171 710 792 белорусских рубля.

3. Информация о суммах расходов фонда:

- расходы, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, определенных уставом – 122 037 815 белорусских рублей;
- расходы, понесенные фондом от осуществления в соответствии с уставом фонда предпринимательской деятельности, – 1 093 240 727 белорусских рублей;
- прочие расходы фонда, не запрещенные законодательством Республики Беларусь, – 1 367 154 117 белорусских рублей.

4. Стоимость чистых актив фонда на 31 декабря 2014 года – 152 239 851 белорусский рубль.

5. Фонд не является учредителем унитарных предприятий, хозяйственных обществ и не участвует в создании других юридических лиц.

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**ЗАО «Центр промышленной оценки» (организатор аукциона) по поручению Копыльского районного потребительского общества (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже объектов недвижимого имущества, расположенных по адресу: Минская обл., Копыльский р-н, г. Копыль, ул. Минская, д. 13, в составе:**

**здание конторы,**
**инвентарный номер 642/С-3970, об. пл. 53,1 кв.м;**
**бондарный цех,**
**инвентарный номер 642/С-11432, об. пл. 107,7 кв.м (д. 13 В);**
**заготовительный магазин,**
**инвентарный номер 642/С-11431, об. пл. 248,1 кв.м (д. 13 Б).**

Площадь земельного участка – **2,1974 га** (предоставлен продавцу на праве аренды; ограничение: 0,3214 га – охранная зона линий электропередачи до 1000 В).

**Начальная цена с НДС – 307 200 000 бел. руб.**

**Задаток 10% от начальной цены перечисляется: резидентами РБ на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в отделении № 507 г. Минска ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа ЗАО «Центр промышленной оценки».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение **10** (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в порядке, предусмотренном в договоре купли-продажи.

Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, а также определения лица, выигравшего аукцион, оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.**

*Извещение о проведении предыдущего аукциона опубликовано в газете «Народная газета» от 02.11.2013 г.*

Аукцион состоится **26.02.2015** в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис. 1703. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **24.02.2015** до 17.00 по указанному адресу.

**Тел.: +375 17 280 36 37; 8029-183-69-71.**

---

ДОПОЛНИТЕЛЬНОЕ ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 19 февраля 2015 года проводит 3/13 повторный открытый аукцион от 06.03.2013 года на 3-ем открытом аукционе

| Лот | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 50/13 | Мастерская передвижная на железнодорожном ходу МХ-М № 38 1990 г. 4 кат. КР-1990 г. в составе: Кузнечный цех – крытый вагон №20420071 1956 г. Инструментально-механический цех – крытый вагон №20115895 1956 г. Механический цех №1 – крытый вагон №22869937 1956 г. Механический цех №2 – крытый вагон №20862207 1956 г. Электросиловой цех – крытый вагон №20096661 1956 г. Электроремонтный цех – крытый вагон №20608824 1956 г. Слесарно-сварочный цех – крытый вагон №20574596 1956 г. Агрегатно-ремонтный цех – крытый вагон №20020681 1954 г. Авторемонтный цех – крытый вагон №20032363 1958 г. Цех ремонтна дизельных двигателей – крытый вагон №20748190 1952 г. | г. Слуцк, в/ч 18662 | 1 861 000 000 | 186 100 000 |
| 51/13 | Мастерская передвижная на железнодорожном ходу МХ-М № 21 1986 г. 4 кат. ДР-1990 г. в составе: Кузнечный цех – крытый вагон №20681730 Инструментально-механический цех – крытый вагон №20269114 -Механический цех №1 – крытый вагон №20268876 -Механический цех №2 – крытый вагон №20268777 -Электросиловой цех – крытый вагон №20220885 -Электроремонтный цех – крытый вагон №20268884 -Слесарно-сварочный цех – крытый вагон №20339560 -Агрегатно-ремонтный цех – крытый вагон №20260147 -Авторемонтный цех – крытый вагон №20260030 -Цех ремонта дизельных двигателей – крытый вагон №20220877 Все вагоны – 1971 г. | г. Слуцк, в/ч 18662 | 1 551 000 000 | 155 100 000 |
| 52/13 | Тепловоз ЧМЭ-3 № 915 дв. К6С31ОДР №411009-4203 генератор TD 802 №1583208 1970 г. 2 кат. пробег 21 год 6 мес. | п. Жодино, в/ч 48848 | 1 622 000 000 | 162 200 000 |
| 53/13 | Мост автодорожный (шифр ВАР) № 1 1981 г. 2 кат. наработка 0,5 года | п. Жодино, в/ч 48848 | 1 615 000 000 | 161 500 000 |
| 54/13 | Мост автодорожный (шифр ВАР) № 2 1981 г. 3 кат. наработка 0,5 года | п. Жодино, в/ч 48848 | 1 615 000 000 | 161 500 000 |

Условия и порядок проведения аукциона опубликованы в газете «Звязда» № 9 от 17.01.2015 г.

**Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81. Наш адрес в Интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.**

УНП 101099370

---

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

## РУП «БЕЛСПЕЦКОНТРАКТ» 19 марта 2015 года проводит 5-ый открытый аукцион по продаже имущества республиканской собственности

| Номера лотов | Наименование техники | Местонахождение объекта | Начальная цена продажи (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| 50 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 108510059 дв. 950489 1985 г. 4 кат. 314 км 16 м/ч | г. Минск, в/ч 63755 | 400 000 000 | 40 000 000 |
| 51 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 108002011 дв. 454005 1980 г. 4 кат. 11250 км 17 м/ч | г. Минск, в/ч 63755 | 400 000 000 | 40 000 000 |
| 52 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 108002022 дв. 832158 1980 г. 4 кат. 518 км 5 м/ч | г. Минск, в/ч 63755 | 400 000 000 | 40 000 000 |
| 53 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 108501016 дв. 041029 1985 г. 4 кат. 6214 км | г. Минск, в/ч 63755 | 410 000 000 | 41 000 000 |
| 54 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 108501049 дв. 894695 1985 г. 4 кат. 400 км | г. Минск, в/ч 63755 | 390 000 000 | 39 000 000 |
| 55 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 108401056 дв. 850791 1984 г. 4 кат. 527 км | г. Минск, в/ч 63755 | 390 000 000 | 39 000 000 |
| 56 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 108401052 дв. 848469 1984 г. 4 кат. 424 км | г. Минск, в/ч 63755 | 390 000 000 | 39 000 000 |
| 57 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 108602029 дв. 875082 1986 г. 4 кат. 3436 км | г. Минск, в/ч 63755 | 390 000 000 | 39 000 000 |
| 58 | Гусеничное шасси МТ-Лбу ш. 108205008 дв. 733885 1982 г. 4 кат. 3458 км | г. Минск, в/ч 63755 | 390 000 000 | 39 000 000 |

**Аукцион** состоится по адресу: г. Минск, ул. Казинца, д. 2, 6-й этаж **19 марта 2015 г. в 11.00.**

К участию в аукционе допускаются юридические лица, индивидуальные предприниматели и физические лица, оплатившие задаток и подавшие заявление на участие в аукционе, учредительские и другие необходимые документы до **17.00 16 марта 2015 года**.

**Победитель аукциона обязан:**

1. Заключить договор купли-продажи не позднее 3-х дней с момента проведения аукциона.

2. Произвести оплату стоимости движимого имущества разовым платежом в течение **5**-ти банковских дней для резидентов Республики Беларусь и **10**-ти банковских дней для нерезидентов Республики Беларусь со дня подписания договора купли-продажи.

Задаток, обеспечение штрафа и денежные средства победителем лота перечисляются на расчетный счет РУП «Белспецконтракт»: 3012244970018 в ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр. Машерова, 29, код 153001739, УНП 101099370, БИК 153001369. **Без НДС**.

**Справки по тел.: (017) 398 07 81, факс (017) 398 07 81.**

**Наш адрес в Интернете: www.bsk.by, mail@bsk.by.**

---

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## ООО «АРТЕС-СТРОЙИНВЕСТ»

информирует юридических и физических лиц о строительстве объекта: «Группа многоквартирных жилых домов по генплану №№ 11, 12, 13 в микрорайоне № 1 реконструируемой застройки в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая дер. Сухарево)» (далее – Объект).

**ЗАСТРОЙЩИК** по Объекту – ООО «АРТЕС-СТРОЙИНВЕСТ» зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 15.05.2008 г., в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 191024785. **Адрес**: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 16, пом. 2Н, каб. 1, тел. 306-06-11. Режим работы: понедельник–пятница: с 09.00 до 17.30, выходные дни – суббота, воскресенье.

Застройщиком осуществлено строительство жилых домов по адресу: г. Минск, ул. В. Игнатовского, д. 8 (2009-2010 гг.), ул. Мачульского, 24 (2012-2014), ул. Академика Карского, 4 (2012-2014).

**Объект состоит** из домов №№ 11, 13 (конструкции ОАО «МАПИД») и № 12 корпус 1, 12 корпус 2 (конструкции ОАО «МДК»), по генплану в границах ул. Шаранговича, Горецкого, Рафиева (бывшая дер. Сухарево), инженерных сетей и инженерно-транспортной инфраструктуры. Дома запроектированы с техническим подпольем и теплым чердаком, предусмотрено центральное отопление. Благоустройство дворовой территории: детская игровая площадка, места для отдыха взрослых, малые архитектурные формы.

К долевому строительству предлагается жилой дом №12 корпус 2 по генплану на 128 квартир в конструкциях серии ОКПМ ОАО «МДК».

**Цель проекта строительства** – исполнение решения Мингорисполкома «Об изъятии, предоставлении, прекращении права пользования земельными участками, разрешении строительства и внесении изменения в решение Мингорисполкома» №997 от 17 апреля 2014 г.

**Сведения об объекте:**

Срок начала строительства объекта (ж/д № 12 к.2) – июнь 2014 г.

Нормативный срок продолжительности строительства объекта (ж/д № 12 к.2) без наружных инженерных сетей и благоустройства, в соответствии с проектной документацией – 13,5 мес.

Срок ввода в эксплуатацию объекта (ж/д №12 к.2) – декабрь 2015 г.

Общая площадь квартир объекта (ж/д №12 к.2) – 8 088,48 м² (128 квартир).

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет находиться в общей долевой собственности дольщиков после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, вентшахты, коридоры, крыши, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых домов и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

***Для заключения договоров долевого строительства с гражданами, не состоящими на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, предоставляются в*** жилом доме № 12 корпус 2 по генплану следующие квартиры:

**10 (десять) однокомнатных** квартир по цене **1 250** (одна тысяча двести пятьдесят) долларов США 1 м² объекта долевого строительства с оплатой стоимости объекта долевого строительства по курсу Национального банка Республики Беларусь на день платежа в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора. Цена 1 м² объекта долевого строительства сформирована на 30.01.2015 г.;

**10 (десять) двухкомнатных** квартир по цене **1 150** (одна тысяча сто пятьдесят) долларов США 1 м² объекта долевого строительства с оплатой стоимости объекта долевого строительства по курсу Национального банка Республики Беларусь на день платежа в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора. Цена 1 м² объекта долевого строительства сформирована на 30.01.2015 г.;

**10 (десять) трехкомнатных** квартир по цене **1 070** (одна тысяча семьдесят) долларов США 1 м² объекта долевого строительства с оплатой стоимости объекта долевого строительства по курсу Национального банка Республики Беларусь на день платежа в течение 7 (семи) банковских дней со дня регистрации договора. Цена 1 м² объекта долевого строительства сформирована на 30.01.2015 г.

В зависимости от типа квартир, размера первоначального и сроков внесения последующих платежей применяется гибкая система скидок.

Квартиры передаются дольщикам без чистовой внутренней отделки.

Условия ознакомления дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству: по согласованию с Застройщиком.

**Застройщик имеет следующие разрешительные документы**:

- разрешение на проведение проектно-изыскательских работ – Акты выбора размещения земельного участка, утвержденные председателем Мингорисполкома 27.04.2011 г. и 08.12.2011 г.;
- решение Минского городского исполнительного комитета от 17 апреля 2014 года № 997 о разрешении строительства объекта;
- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков:

постоянного пользования №500000000006007361, площадью 0,1617 га;
постоянного пользования 500000000006007360, площадью 0,1859 га;
временного пользования 500000000006007362, площадью 0,5736 га;

- проектно-сметная документация, прошедшая государственную экспертизу (экспертное заключение, выданное РУП «Главгосстройэкспертиза» от 27.02.2014 г. № 46-15/14;
- договор строительного генподряда № 03-2014 от 31.03.2014 г., заключенный с ОАО «Минский домостроительный комбинат»;
- договор о долевом участии в финансировании проектирования и строительства инженерной и транспортной инфраструктуры № 11/И-2012 от 16.05.2012 г., заключенный с КУП «УКС администрации Фрунзенского района г. Минска»;
- выданное органом государственного строительного надзора разрешение на проведение строительно-монтажных работ № 2-208Ж-020/14.

**Информацию об объекте долевого строительства**, планировках квартир и условиях заключения договоров можно получить у Застройщика по телефону 8 (044) 5846928 или 8 (017) 3060611, 8 (017) 3060677.



## КРЫЖАВАНКА-ПЕРАКЛАД

**Перакладзіце з рускай мовы на беларускую наступныя словы:**

**Па гарызанталі: 6.** Разнообразно. **8.** Камыш. **10.** Горести, лишения. **11.** Ларь, сундук. **14.** Бугор, холм. **16.** Добавление; приложение. **17.** Черта. **18.** Языковед. **19.** Справка. **21.** Плоды, урожай. **22.** Бархат. **23.** Пуля. **26.** Амбар. **27.** Отдельно, особняком. **28.** Сокровище. **30.** Отчет.

**Па вертыкалі: 1.** Случай, повод. **2.** Священный огонь. **3.** Сердцевина, сердечник. **4.** Шутка. **5.** Сныть (бот.). **7.** Нетерпеливый, неугомонный. **9.** Опозоренный, опороченный. **12.** Мурмолка (войлочная шапка). **13.** Набекрень. **15.** Ковер. **17.** Строка. **20.** Потомок, отпрыск. **24.** Оттоманка. **25.** Остаток. **28.** Вкус. **29.** Кибитка (крытая повозка).

**Склала Таццяна КУЗЬМІЧ.**
г. Віцебск.

**Праверце, калі ласка, адказы.**

**Па гарызанталі:** 6. Разнастайна. 8. Чарот. 10. Нягоды. 11. Скрыня. 14. Груд. 16. Дадатак. 17. Рыса. 18. Мовавед. 19. Даведка. 21. Плён. 22. Аксаміт. 23. Куля. 26. Свіран. 27. Асобна. 28. Скарб. 30. Справаздача. **Па вертыкалі:** 1. Нагода. 2. Зніч. 3. Асяродак. 4. Жарт. 5. Снітка. 7. Няўрымслівы. 9. Знеслаўлены. 12. Магерка. 13. Набакір. 15. Дыван. 17. Радок. 20. Нашчадак. 24. Канапа. 25. Астача. 28. Смак. 29. Буда.

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск | 8.34 | 18.14 | 9.40 |
| Віцебск | 8.27 | 18.00 | 9.33 |
| Магілёў | 8.24 | 18.04 | 9.40 |
| Гомель | 8.17 | 18.05 | 9.48 |
| Гродна | 8.49 | 18.30 | 9.41 |
| Брэст | 8.45 | 18.34 | 9.49 |

**Месяц**

*Апошняя квадра 12 лютага.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

**Імяніны**

***Пр.** Віктара, Івана, Кіра, Клаўдзія, Мікіты, Нікіфара.*
***К.** Арлеты, Катарыны, Рыгора, Юльяна.*



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ЗАЎТРА






# СЕМЕНА – ПОЧТОЙ.

## Со своего огорода.

**Сажайте, удивляйтесь, наслаждайтесь!**

***Много лет выращиваю овощи на своем огороде с минимальным поливом и без пленки. Отбираю самые урожайные и ценные, адаптированные к местным условиям, заготавливаю их семена, которые и предлагаю овощеводам-любителям.***

Дыня «**Белорусская ранняя**» – до 4 кг. Арбуз «**Бобруйский**» – до 7 кг.
**ТЫКВЫ.** «**Титан**» – до 100 кг, «**Кавбуз**» – до 40 кг. «**Витаминная**» (5–7 кг) и «**Зимняя сладкая**» (до 20 кг) – обе сладкие, с оранжевой мякотью, хранятся всю зиму в доме.
**КАБАЧКИ.** «**Белый якорь**» (белые, очень ранние). «**Вьетнамский**» – спелые – очень сладкие, вкусные, с оранжевой мякотью, долго хранятся.
**ОГУРЦЫ.** *Очень ранние* – «**Малыш**». *Ранние* – «**Пальчик**» (долго и обильно плодоносят). *Ранне-средние* – «**Капелька**», «**Верасень**», «**Конкурент**». Все огурцы мелкие, засолочные, устойчивые к болезням.
**ПЕРЕЦ СЛАДКИЙ** красный, урожайные сорта: «**Маркони**» – ранний, длинный, «**Трапеза**» – среднеспелый, толстостенный, кубышка, «**Александр**» (круглый).
**ПЕРЕЦ ОСТРЫЙ** «**Длинноплодный**» среднеранний, куст 40 см, плоды красные, ароматные.
**ПОМИДОРЫ.** ***Ультраранние, низкие, плоды 100 гр*: «Альфа», «Чиполлино», «Весенний хоровод», «Женечка», «Чибис»** – плоды удлиненные, с «носиком», «**Майская роза**» – розовые. «**Золотое сердце**» – желтые, плотные, до 200 гр.
***Ранние, низкие, плоды до 120 гр.*** – «**Красная шапочка**» и «**Утенок**» (оранжевые, с «носиком») – очень урожайные, идеальны для закатки; «**Павловская роза**» (розовые); «**Подарок брата**» и «**Вилина**» – оба вкусные, урожайные, наиболее устойчивые к фитофторозу; «**Ляна**», «**Ротон**» – красивые, плотные, по ведру плодов с куста, с повышенной устойчивостью к фитофторозу; «**Первая любовь**» – розовые, до 400 гр., куст – 80 см.
***Холодостойкие***, низкие, ранние – «**Снежная королева**» (120 гр, хорошо переносит засуху, устойчива к болезням); «**Сибиряк**» – до 200 гр.
***Среднеспелые, низкие*: «Талаш» и «Топтыгин»** – до 200 гр., вкусные, урожайные.
***Среднеспелые***, *куст 80 см, 120 гр*: «**Дина**» – плоды желтые, как хурма, плотные, и «**Лисичка**» – оранжевые, продолговатые, долго и обильно плодоносят. «**Джина**» – 250 гр.
***Крупноплодные***, куст 1 м, хорошо растут и в открытом грунте и в теплице: «**Тещина радость**» (розовые), «**Золотые купола**» и «**Грейпфрут**» (самые сладкие) – все до 1 кг; «**Черный русский**» и «**Бычье сердце**» – до 600 гр., «**Розовый мед**» (сердцевидные, 500 гр.) «**Черный принц**» – до 300 гр., «**Райское наслаждение**» (розовые) и «**Оранжевый великан**» – 400 гр.
***Тепличные***, они же хороши и для гряд (высокие): «**Красная стрела**» и «**Мулат**» (коричневые) – оба 100 гр., очень урожайные и вкусные, «**Медовая капля**» – 30 гр, желтые, сладкие. «**Ягодное лукошко**» – смесь сортов «Черри».
***Высокие*** для гряд – ***с высокой устойчивостью к фитофторозу*** – «**Де-Барао**»: **красный, желтый, черный.**
**КОМНАТНЫЕ ПОМИДОРКИ: Смесь сортов** – компактный кустик 30 см, плоды красные, желтые, оранжевые, 20 гр.; «**Балконное чудо**» – 60 см, 40 гр.
**Комнатный перчик «Огонек»** – умеренно острый, плоды напоминают языки пламени.
Семена расфасованы: сладкий перец, огурцы, помидоры по 30 шт. в пакетике и более, все остальные – по 10–15 шт. Высылаю наложным платежом 5500 рублей за пакетик. К общей стоимости заказа прибавлю 16 тыс. рублей (за пересылку). За каждые 10 заказанных пакетиков – **2 дополнительных** высылаю **бесплатно** (укажите, что именно) и свою **Агротехнику** выращивания. Свой адрес и Ф.И.О. пишите **полностью** и **разборчиво**. Оплата при получении семян на почте.

**Мой адрес: 213801, Могилевская обл., г. Бобруйск, 1.**
**До востребования ПРОКОПЧИКУ Виктору Павловичу.**
**Электронный адрес e-mis@mail.ru**


Даты | Падзеі | Людзі

**13 ЛЮТАГА**

**1705** год — 310 гадоў таму нарадзілася Францішка Уршуля Радзівіл, пісьменніца, драматург. Яна паходзіць з роду Вішнявецкіх, была жонкай М.К. Радзівіла Рыбанькі. Лічылася адной з самых адукаваных жанчын свайго часу. З 1725 года жыла ў Нясвіжы, па яе ініцыятыве заснаваны першы ў гісторыі славян палацавы Нясвіжскі тэатр Радзівілаў. Для яго яна напісала 16 драматычных твораў і оперных лібрэта, перакладала творы Мальера і Вальтэра. Пісала на польскай, італьянскай, французскай і нямецкай мовах. Садзейнічала аднаўленню дзейнасці Нясвіжскай друкарні. Памерла ў 1753 годзе.



**1769** год — нарадзіўся Іван Андрэевіч Крылоў, рускі пісьменнік, байкапісец. «Яго творы — народны здабытак і складаюць кнігу мудрасці самога народа», — так казаў пра байкі Івана Крылова майстар слова Мікалай Гогаль. Для твораў Крылова характэрныя рэалістычная выразнасць, выдатная мова, здаровы гумар і ідэальны пераказ. Сюжэты некаторых з іх ён запазычыў у Эзопа і Лафантэна, але большасць — арыгінальныя. Творчая спадчына пісьменніка складае больш за дзвесце баек, яны перакладзены на 50 моў свету, у тым ліку на беларускую. У 1812 годзе Крылоў стаў супрацоўнікам Публічнай бібліятэкі Пецярбурга, у якой праслужыў 30 гадоў. Вядомы байкапісец быў таксама добрым збіральнікам кніг, укладальнікам бібліяграфічных паказальнікаў і аўтарам славяна-руска слоўніка.

**1955** год — 60 гадоў таму нарадзіўся (г. Мінск) Рыгор Аляксеевіч Васілевіч, беларускі дзяржаўны дзеяч, вучоны-прававед, доктар юрыдычных навук (1994), прафесар (1998), заслужаны юрыст Беларусі (1994). У 1980 годзе скончыў БДУ. Працаваў у Сакратарыяце Вярхоўнага Савета, быў старшынёй Канстытуцыйнага Суда Беларусі, Генеральным пракурорам Беларусі, цяпер працуе ў БДУ загадчыкам кафедры. Браў удзел у распрацоўцы Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (1994). Аўтар навуковых прац па праблемах тэорыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага і працоўнага права, арганізацыі работы дзяржаўнага апарату, прававога статусу асобы, узаемаадносін чалавека і дзяржавы.

**Было сказана**

**Како ШАНЕЛЬ, французскі мадэльер:**

*«Ёсць час працаваць і ёсць час кахаць. Ніякага іншага часу не застаецца».*

## УСМІХНЕМСЯ

— Мне ёсць чым ганарыцца! У гэтым жыцці я ўсяго дамогся сам!
— Дык ты ж нічога і не дабіўся!
— Затое ўсё сам!

**Раніцай у суботу муж збіраецца на працу — зайсці на пару гадзін дакументы разабраць. Надзявае на сябе джынсы, футболку, абувае красоўкі. Жонка на яго глядзіць і кажа:**
**— Дарагі, так нельга ісці: майка пакамечаная, джынсы брудныя... Лепш пераапраніся.**
**Не праблема — муж надзявае прыстойныя штаны, кашулю, завязвае гальштук. Жонка:**
**— І куды гэта ты прыбраўся, гуляка?!**






Дарагіх сыноў
**Рыгора, Уладзіміра і Сяргея ЛУГОЎСКІХ**
шчыра віншуем з днём народзінаў!
*Просім для вас у Бога*
*Светлага шляху зямнога:*
*Шчасця, здароўя — многа*
*І каб зброяр ад злога!*
**Мама і дзядзька Жэня.**

Шаноўную **Валянціну Марцінаўну АРЭХ**
з Мінска шчыра віншуем з сямідзесяцігоддзем! Зычым моцнага здароўя, шчасця, добрага настрою, цёплых, сонечных дзён!
**Сем'і Арэхаў, Сямашак, Маскевічаў.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫЛА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК.
Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 38, 287 17 21, бухгалтэрыі: 287 18 81.
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by,
(для зваротаў): zvarot@zvyazda.minsk.by
ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by
Матэрыялы, пазначаныя гэтым знакам, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.
220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.
Тыраж 20.198. Індэкс 63850. Зак. № 601.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
Нумар падпісаны ў 19.30 12 лютага 2015 года.